Пр. етарыі ўсіх краін, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich ... łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
14 красавіка 1931 г.
№ 86 (3174)

Савецкая Беларусь
Мохнач

За баявую гатоўнасьць!

1.040 новых МТС, якія ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі ўступаюць у строй, павінны адыграць вялізарнейшую ролю ў завяршэньні фундамэнту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, у разгорнутым сацыялістычным наступленьні на ўсім фронце, у пашым прасоўваньні па шляху суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе базе кулацтва, як клясы. Кожная новая МТС—гэта новы фарпост сацыялістычнага наступленьня, гэта новы важнейшы рычаг у барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі.

МТС—не пракатны пункт. Значэньне МТС менавіта ў тым, што яна, падрыўаючы карэньні кулацкай эксплёатацыі, узброівае новай тэхнікай сельскае гаспадаркі масы бядняцка-сераднацкага сялянства і вядзе іх да сацыялістычнай арганізацыі працы, вядзе іх да сацыялістычнага грамадзтва.

Толькі пад гэтым кутом погляду і неабходна ацэньваць значэньне тых 24 МТС, якія ўвесну бягучага году будуць разбураць дзядоўскія межы, зьні шчаць прэталосіцу, перарабляць дробную распыленую сялянскую гаспадарку ў гаспадарку буйную калгасную. 24 МТС—гэта буйнейшы крок Савецкай Беларусі па шляху ўздыму сельскае гаспадаркі на асновах калектывізацыі.

МТС паказалі ўжо вузоры бальшавіцкай барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі. Нават маладыя МТС у БССР маюць у сваім балянсе ня мала бліскучых перамог. Мы ведаем якое вялізарнейшае рэвалюцыянізуючае значэньне набыла Койданаўская МТС, якая амаль не палвойна павялічыла процант калектывізацыі сялянскіх гаспадарак раёну і забясьпечыла ў асноўным пасьпяховае выкананьне вытворчых заданьняў летаўніх сельска-гаспадарчых кампаній. Пажаль, гэтым вопытам перадавых МТС ні Беларускае аддзяленьне Трактарацэнтру, ні Белкалгасцэнтр ня ўзброілі тыя новыя станцыі, якія ў сёлетнюю весну ўпяршыню пачнуць праводзіць веснавую сяўбу.

Адсутнасьцю вопыту ў маладых МТС, недастатковай увагай раду мясцовых арганізацый, а часам простай апартуністычнай недаацэнкі МТС мож на тлумачыць рад прарываў, якія ўжо вызначыліся на гэтым вучастку нашай барацьбы і работы. На самой справе, калі слабы завод трактароў, абсалютную недастатковасьць прычэпнога інвэнтара і запасных частак у радзе МТС можна тлумачыць радам «аб'ектыўных» прычын, у шэрагу якіх ня мала месца займае адсутнасьць спэрацыйнасьці, баявых тэмпаў у рабоце Беларускага аддзяленьня Трактарацэнтру,—дык чым тлумачыць, напрыклад, такі факт, што Копыская МТС ня мае да гэтага часу плянаў-карт з дакладным паказаньнем маршрутаў трактароў, чым тлумачыць, што Слуцкая МТС яшчэ да гэтага часу не ўстанавіла вытворчых вучасткаў сваёй дзейнасьці?

Чым тлумачыць той факт, што да гэтага часу дагаворная кампанія ў вялікім радзе МТС не закончана? А дагаворная-ж кампанія—гэта першая стадыя работы МТС, першая і прытым надзвычайна важная стадыя. Менавіта ў працэсе дагаворнай кампаніі МТС больш за ўсё выяўляе сваю ролю праваднікa калектывізацыі. Менавіта ў працэсе дагаворнай кампаніі з МТС узьнімаецца хваля калгаснага прыліву.

Чым тлумачыць тое, што ў значнай колькасьці МТС дагаворы не адраманТаваны і нават не разабраны цалкам увесь інвэнтар, што ня скончана будаўніцтва складзкіх памяшканьняў, нафтахавальнікаў і г. д.?

Чым тлумачыць тое, напрыклад, што пляны Мсьціслаўскай МТС ня ўвязаны з плянамі Мсьціслаўскага раёна калгасаюзу, што на курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў для гэтай станцыі пралезьлі чужыя элементы?

Чым тлумачыць тое, што дагаворы спаравая яда на трактарох не праведзена ў большасьці МТС, што ў раёнах дзейнасьці МТС калгасы яшчэ цалкам не перайшлі на зьдзельшчыну, што яшчэ значна кульгае культработа?

Усё гэта трэба тлумачыць толькі недаацэнкай МТС, іх значэньня, іх ролі ў барацьбе за суцэльную калектывізацыю. Усё гэта трэба тлумачыць тым, што МТС пячэ далёка ня ўсюды сталі ў центры ўвагі мясцовых партыйных, савецкіх і кааперацыйных арганізацый. Усё гэта трэба тлумачыць адсутнасьцю спартуністычных адносін да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай справы.

Тэрмін сяўбы ўсё набліжаецца. Вясна і так спазьнілася. Вясна сёлета будзе кароткай. Таму неабходны сапраўдны бальшавіцкія тэмпы. Таму неабходны сапраўдны штурм прарываў у МТС.

Трэба ясна ўсьвядоміць сабе, што МТС яшчэ не гатовы цалкам да весьнавой сяўбы, і з гэтага трабіць належныя вывады.

Скончыць будаўніцтва, падрыхтаваць гаражы, складзкія памяшканьні, нафтахавальнікі.

Баявымі тэмпамі фазгарнуць работу па скончаньні дагаворнай кампаніі.

Зараз-жа перайсьці на спараную язду, прымацаваць трактары да трактарыстаў і тым забясьпечыць трактарны парк ад паломак і псаваньня.

Неадкладна чотка вызначыць вытворчыя вучасткі дзейнасьці МТС, рас працаваць плян-карту маршрутаў заездаў трактароў і забясьпечыць поўную нагрузку трактароў.

У калгасах, з якімі МТС заключылі дагаворы, разгарнуць барацьбу за зьдзельшчыну з такім разьлікам, каб выхад у поле МТС і калгасаў быў пабудаваны на глебе зьдзельшчыны.

Зусім зразумела, што ўсё гэтыя задачы трэба выконваць адначасова, не раскладаючы іх па паліцах, памятаючы, што кожная з гэтых задач—зьяўляе адной задачы: барацьбы за калектывізацыю, за баявое правядзеньне веснавой сяўбы.

Трэба памятаць, што МТС толькі тады бліскуча выканаюць свае задачы, калі з карэньнямі будуць выкарчаваны спартуністычныя адносіны да іх, калі ў барацьбе за МТС мы супроць кулака і яго агентаў-спартуністаў арганізуем мільённыя масы бяднаты і сераднацтва і павядзем іх уперад, да суцэльнай калектывізацыі, да ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва як клясы.

Працэс па справе контр-разьведчыка Палянскага,—які рабіў замах на ўзрыў савецкага палпрэдзтва

У ВАРШАВЕ,—ЗАКОНЧАН

Фашысцкі суд, выкарыстаўшы працэс для антысавецкіх выпадаў, красамоўна абыйшоў тых, хто стаіць за сьпіной Палянскага,—хто правацыруе зрыў міру

Апошні дзень працэсу—ператвораны у антысавецкі мітынг

ВАРШАВА, 13. Апошні дзень працэсу Палянскага ператвараецца ў бесшабашны антысавецкі мітынг, які разгарнуўся з тым большай сілай, што галоўны націск антысавецкіх прамоў стрымліваецца рэжысорамі працэсу да апошняга дню. Выходным пунктам для антысавецкага мітынгу была ўжо прамова пракурора, які, дэманструючы сваю «стрыманасьць» па дыплёматычных меркаваньнях, не закранаючы быццам пад гэтым відам цэлага раду галоўнейшых мейсц і пакідаючы рад недамоўнасьцяй, дае повад абароне накінуцца на палпрэдства СССР у Варшаве, якое быццам «бярэ пад сумленьне незалежнасьць Польшчы, і польскага суду і дамаўляе польскаму суду ў праве выносіць свой незалежны прыгавор».

Пракурор, які патрабуе «самага суровага пакаранья», адстойвае сапраўднасьць «тэзісаў», тэзіса аб «бязумоўнай прыналежнасьці Палянскага да камуністычнага руху на пэўным этапе яго «дзейнасьці», і другога тэзіса аб «бязумоўнай блізкасьці» Палянскага да палпрэдства СССР у Вене, хоць пракурор гатоў прызнаць, што савецкая нота абвяргае заяву аб службе Палянскага ў палпрэдстве СССР. Гэтыя «тэзісы» (пракурора не ў малой ступені дапамагалі наглай бесцэрамоннасьці абароны. Дапамогу абароне аказвае пракурор таксама ў той частцы сваёй прамовы, калі ўстанаўляе ў заключэньне свайго аналізу фактычны бок замаху. Пракурор насуперакі паказаньням экспэртызы, заяўляе, што ў агульным выбух ня мог адбыцца, бо незалежна ад сваёй волі Палянскі ня мог уключыць смантыраваную ім на даху палпрэдства СССР пякельную машыну па той «простай» прычыне, што электрычная праводка з прычыны кароткага замыканьня бязь дзейнічала яшчэ тады, калі Палянскі быў у Гродні і ня мог натуральна пітаць электрычную адскую машыну.

Яшчэ больш характарна наступная заява пракурора. У сваёй рэпліцы ён як-бы даў неабходнасьць апраўдвацца, што ён не далучае свайго голасу да антысавецкіх спрэчак таму, што «у справе і ў матар'ялах справы ён не знайшоў ніякіх даных для таго, каб даць палітычную ацэнку таму, што адбываецца ў СССР». Аднак, на пытаньне, якое было пастаўлена абаронай, якія матывы па думцы пракурора кінулі Палянскага на гэтую справу, пракурор на вялічэзнае здавальненьне абароны адказаў, што гэтыя матывы заключаюцца «ў адплаце бальшавікам за яго крыўды».

Антысавецкі мітынг адкрывае абаронца Гофмокль-Астроўскі.

Вэрсыя аб вар'яцтве Палянскага здаецца ў архіў і абарона даводзіць, што адносіны Палянскага і яго няна-вісьць да палпрэдства СССР разьдзяляецца ўсім «культурным сьветам». Абаронца кажа аб 88 савецкіх агентах у Варшаве. Гэтая лічба супадае з лікам супрацоўнікаў пасольства ў Варшаве, якія пільна сочаць за расійскай эміграцыяй. Абаронца заклікае суд прыняць пад увагу, што ўчынак Палянскага можа быць прызнаны «шляхетным і карысным» у вачох грамадзкай думкі Эўропы.

Абаронца даходзіць да такіх «юмарыстычных» заяў, што польскі ўрад калі-б хацеў узарваць савецкае пасольства, ён-бы меў дастатковую колькасьць сродкаў для таго, каб выканаць гэтую справу добра і пасьпяхова. Гофмокль-Астроўскі заклікае судзьдзяў памятаць пры вынясеньні прыгавору, што перад тварам двух суседаў, якія мае Польшча з Усходу і з Захаду, кожны паляк кладзецца і пра чынаецца з заўсёднай думкай аб тым, што ён можа быць у любы момант пры званы да зброі па прыкладу 1920 году.

Пасьля артылерыйскай падрыхтоўкі Гофмокль-Астроўскага старэйшага выступае менш талянавіты яго брат, які казырае направа і налева мемуарамі Бесядоўскага. Спасылаючыся на Бесядоўскага абаронца гаворыць аб «бомбах, якія знаходзяцца ў сэйфах палпрэдства» і аб «аддзелах ЦК і Камінтэрна, якія знаходзяцца ва ўсіх дыплёматычных прадстаўніцтвах СССР».

Польскія судзьдзі добра ведаюць, працягвае свае наглыя выпады абаронца № 2, што мы вынесьлі ня мала прыгавораў людзям, падкупленым «камінтэрнаўскім аддзелам пасольства». Закрануўшы размовы аб «шпіёнскай і камінтэрнаўскай дзейнасьці» «на сродкі, савецкага палпрэдства» аб «жахах ЧК» адбываецца антысавецкі мітынг па шаблёну, устаноўленаму ўжо на працэсе Каверды і Вайцэхоўскага.

Спачатку старшыня суду вяла зварочвае ўвагу абароны на недапушчальнасьць асобных выпадаў, але потым сам відавочна захапляючыся любімай і роднай яму антысавецкай музыкай зусім забываецца, што ён зьяўляецца старшынёй суду, а не старшынёй мітынгу антыбальшавіцкай лігі.

Пад бацькаўскім апякунствам Казакоўскага, які паслаў сотні рабочых і сялян на катаргу, абаронца назырав тэзісам аб тым, што ідэя, якая штурхнула Палянскага на ўзрыў палпрэдства СССР «родная палякам».

Апошні дзень працэсу прайшоў пад знакам ні чым ня прыкрытых антысавецкіх выступленьняў на афіцыяльных паседжаньнях польскага суду.

У выніку працэсу абарона патрабуе ня толькі поўнага апраўданьня Палянскага, але і ўвянчаньня яго лаўравым вянком «героя і мсьціўцы за культуру і чалавецтва».

Прыгавор па справе Палянскага

ВАРШАВА, 13. А 5 гадзіне і 20 хвілін увечары пасьля кароткай нарады суд агаласіў свой прыгавор: Палянскі прызнаны вінаватым у падрыхтоўцы замаху на ўзрыў будынку савецкага пасольства ў Варшаве.

Прыгавор канстатаваў, што замах Палянскі арганізаваў ня з мэтай дэманстрацыі, што заява Палянскага аб прыняцьці мер для папярэджаньня выбуху, у прыватнасьці пераразаньня правадоў, ні чым, апрача галаслоўных заяў абвінавачванага, не сьцьвярджаюцца, што экспэртызай устаноўлена тэхнічная прыдатнасьць пакельнай машыны, разьлічанай на значны эфэкт дзеяньня.

Віна Палянскага, згодна пастановы суду ўскладняецца акалічнасьцю, што замах быў накіраваны супроць дыплёматычнага ўраду, акрэдытаванага ў Польшчы і што, такім чынам, злачынства Палянскага было накіравана на шкоду інтарэсам польскае дзяржавы. Прымаючы ўсё гэта пад увагу суд прыгаварыў Палянскага да 10 год катаржнага вастрогу.

Зараз-жа пасьля агалашэньня прыгавору абаронца Гофмокль-Астроўскі заявіў, што абарона пераносіць справу ў апэляцыйны суд.

Антысавецкі фронт і Нямеччына

Цана, за якую фашысты Нямеччыны згодны прадацца

АДЧЫНЕНАЯ ЗАЯВА «ДЭР ЮНГ-ДЭЙЧЭ»

БЭРЛІН, 10 красавіка. Орган младанямецкага ордэна «Дэр Юнгдэйчэ» зьмяшчае паказальны па сваёй адкрытасьці перадавы артыкул дэпутата рэйхстага Абаля аб спробах Францыі ўцягнуць Нямеччыну ў антысавецкі фронт.

Абэль сьцьвярджае, што Францыя лічыць няўхільным заключэньне аўстра-нямецкага мытнага саюзу і таму стараецца вытаргаваць якую-небудзь кампэнсацыю ад Нямеччыны. Спачэтку французы патрабавалі ўрачыстага прызнаньня Нямеччынай вечнасьці палітычнай самастойнасьці Аўстрыі, потым спрабавалі атрымаць кампэнсацыю ў Саарскай вобласьці. Паводле апошніх паведамленьняў з Парыжа, там гатовы згадзіцца на ажыцьцяўленьне мытнага саюзу паміж Нямеччынай і Аўстрыяй пры ўмове актыўнага ўдзелу Нямеччыны ў арганізуемым Францыяй фронце супроць СССР.

Далей Абэль піша: «Ужо на працягу некалькіх тыдняў Парыж з вялікім напружаньнем чакае зьвестак аб тайных палярэдніх перагаворах, якія быццам адбываюцца паміж Нямеччынай і Савецкім саюзам адносна аднаўленьня Бэрлінскага дагавору. У Парыжы баяцца, што Нямеччына ня толькі адновіць гэты дагавор, але і палітычна значна пашырыць яго. Створаная Брыянам у Нямеччыне арганізацыя атрымала падрабязныя інструкцыі праверыць усё—нават самыя нязначныя палітычныя групоўкі Нямеччыны і высьніць іх адносіны да Савецкага саюзу, а таксама па магчымасьці зрабіць уплыў на іх у выгодным для французкай палітыкі кірунку. Для таго, каб перашкодзіць аднаўленьню Бэрлінскага дагавору, французы ўдуць дыплёматычную і палітычную кампанію, накіраваную да таго, каб дыскрэдытаваць Савецкі саюз і скавать палітычнае і ваеннае колца вакол СССР. У Румыніі робіцца спроба распусьціць парлямант і ставыць ваенную дыктатуру. Аб гэтым румынскі пасол Тытулеску вёў перагаворы ў Лёндане і Парыжы. У Лёндане да Тытулеску аднесьліся стрымана.

У Парыжы Тытулеску атрымаў дару чэньне ад французкага ўраду ў магчыма кароткі тэрмін устанавіць у Румыніі дыктатуру поўнай антысавецкай арыентацыі. У Румыніі існуюць яшчэ апасеньні адносна пазыцыі Турцыі. Апрача таго, яшчэ ня зломлена і ўнутраное супраціўленьне рэжыму дыктатуры. Таму нельга яшчэ ўгадаць, ці зьявіцца фінансавы націск Францыі дастатковым для таго, каб прывесьці ў рух антысавецкую лавіну іменна з Румыніі. А пакуль Румынія ня выявіла сваёй пазыцыі ў антысавецкай барацьбе. Польшча таксама ня прыме канчатковага рашэньня.

Апрача таго, Польшча баіцца Нямеччыны. Паводле атрыманых з Лёндана і інш. гарадоў, палажэньне ў Партугаліі ў сувязі з паўстаньнем на востраве Мадэра, знач на ўскладнілася. Да паўстаньня далучыліся некаторыя гарнізоны на Азоўскіх астравох. Па чутках паўстаньне ахапіла таксама калёнію Ангола (Афрыка).

Урад абавязаўся засаду партоў на Азоўскіх астравох. У самым Лісабоне сярод партугальскіх уладаў назраецца трывога і няўпэўненасьць. Горад запружаны патрулямі і ваеннымі пікетамі. Уведзена строгая цэнзура. У Лісабоне і Апорта ўтворана шматлікія арышты сярод грамадзянскага насельніцтва.

У ТЭРМІН І ПОУНАСЬЦЮ

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ВЯСЕНЬНІХ БУЛЬБАЗАГАТОВАК

Белсадгароднціна, Белкаапсаюз безадкладна павінны прыняць выклік Заходняй вобласьці

Менск—Белсадгароднціне, копія—Белкаапсаюзу, Белсадсаюзу, Белнаркамснабу і рэдакцыі газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

У выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па загатоўцы і адгрузцы насеньлай бульбы ў разьмерах даных заданьнем поўнасьцю і ў тэрмін, Заходняя вобласьць пастановай Абкому абвясьціла ўдарны дзесяцідзеньнік, які пачынаецца 12 красавіка.

Нашай вобласьці дадзена заданьне адгрузіць 22.300 тон насеньня бульбы, з іх Ленінградзкай вобласьці—4.300 тон, Уралу—8.000 тон, Паўночнаму Каўказу—10.000 тон. Арганізацыі, на якіх ускладзены абавязацельствы па выкананьні пляну, выклікаюць на сацспаборніцтва арганізацыі Беларусі на стопроцантнае выкананьні заданьняў ў тэрмін.

Спаборніцтва прапануем на прынцыпах: 1) выкананьня заданьняў у цэлым для Заходняй вобласьці і БССР; 2) спаборніцтва пасобных сыстэм сельска-гаспадарчай і спажывецкай кааперацыі Заходняй вобласьці і БССР; 3) спаборніцтва сыстэм унутры рэспублікі, вобласьці.

Рэдакцыі ўдзельнічаюць у спаборніцтве ўсебаковым асьвятленьнем у сваёй прэсе ходу спаборніцтва.

Прапануем штодзенна, пачынаючы з 15 красавіка, паведамляць Саюзсадгароднціне процант выкананьня заданьня па адгрузцы-за прашоўшы дзень з перадачай копіі паведамленьня рэдакцыі газэты «Рабочий Путь». Адгружанае да 14 красавіка ў паказьнікі не ўключаецца.

Пачынаючы з 15 красавіка высылаем вам, а таксама рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» нашы паказьнікі. Паказьнікі спаборніцтва Заходняй вобласьці і БССР друкуюцца ў мясцовай прэсе.

Тэлеграфуйце аб прыняцьці выкліку Аблснаб—Асокін, Саюзсадгароднціна—Розін, Пальтоў, Садгародсаюз—Карасеў і Тошын, Захсаюз—Мачалаў і Разгонаў, рэдакцыя газэты «Рабочий Путь».

Смаленск.

Выклік прымаем!

Рэдакцыі „Рабочий Путь“ Смаленск

Выклік на сацспаборніцтва па загатоўцы насеннай бульбы прымаем. Сёньня даем першыя весткі ходу загатовак. Арганізуем пасты, брыгады, чыгуначных вузлох і ўстановах ведаючых гэтай справай.

Дадзена паказаньне райкомам і пасланы ліст ударным брыгадам, апэрацыйным пастом і рабселькорам.

Рэдакцыя.

Белільнасаюз прыняў выклік Заходняй вобласьці

Сыстэма сельска-гаспадарчай кааперацыі—Беллёнасаюз паводле пляну па вінна адгружаць насенную бульбу для Украіны.

На сёньняшні дзень адгружана толькі 2,1 проц. пляну.

Адною з прычын слабай адгрузкі насеньня бульбы для Украіны, дзе, дарэчы, сяўба пачата ўжо, зьяўляюцца ўпадачныя настроі і разважаньні (асабліва на Мазыршчыне) аб тым, што буль бы няма, пляну выканаць нельга. Разам з тым у значнай меры затрымлівае адгрузку непадача вагонаў для перавозкі насеннай бульбы.

Пры атрыманьні (12 красавіка) тэлеграмы ад Заходняй вобласьці з выклікам на сацспаборніцтва па 100-процантнай адгрузцы бульбы на насеньня папрэбы Беллёнасаюз адказаў праз НКСнаб прыняцьцем выкліку і адразу-ж (12-IV) ужыў першыя захады па ажыцьцяўленьні сацспаборніцтва, накіраваўшы па раёнах сыпешную тэлеграму такога зьместу:

«У выкананьне дырэктыў партыі і ўраду сельска-гаспадарчыя і загатоўчыя арганізацыі Заходняй вобласьці выклікалі нас на сацспаборніцтва па 100% выкананьні адгрузкі насеннай бульбы з тэрмінам выкананьня 20 красавіка. Выклік намі прынят. Прапануем пад асабістую адказнасьць праўленьня забясьпечыць выкананьне. Адсталыя райкаапсаюзы будуць памешчаны ў газэтах на чорную дошку. Аб ходзе адгрузкі тэлеграфуйце кожны дзень.

Лаціс, Журомскі».

Забясьпечыць выкананьне бульбазагатовак

Адгрузка насеннай бульбы з БССР ускладаецца на дзьве сыстэмы: сельска-гаспадарчую і спажывецкую кааперацыі. Сельска-гаспадарчая кааперацыя адгружае сёлета 1480 тон насеньня бульбы для Украіны; спажывецкая-ж кааперацыя, якою кіруе Белкаапсаюз павінна адгрузіць бульбы на насеньне для Украіны 1416 тон і для Ленінградзкай вобласьці—16000 тон, а разам—17416 тон.

Такім чынам, галоўны цяжар і адказнасьць за своечасовую адгрузку насеньня бульбы для іншых рэспублік і вобласьцяў СССР ускладаецца на Белкаапсаюз.

Наряды па адгрузцы бульбы для Украіны спушчаны на раёны 24 красавіка, а для Ленінградзкай вобласьці—5 красавіка.

На сёньняшні дзень насеннай бульбы адгружана... толькі 30 тон, або 0,17 проц. агульнага заданьня.

Чым-жа тлумачыцца такі нізкі процант адгрузкі насеньня бульбы?—У першую чаргу непаваротлівасьцю, нягібкасьцю апарату Белкаапсаюзу. Да гэтага часу яшчэ не раслана ніводнага прадаўніка на раёны па пытаньнях адгрузкі насеньня бульбы.

Поруч з гэтым праўленьне Белкаапсаюзу ніводнага разу не заслухала дакладу аб ходзе загатовак і адгрузкі бульбы.

У апараце Белкаапсаюзу, які складаецца з 300 асоб, няма адказнага за загатоўкі.

У апараце Белкаапсаюзу яшчэ не атрымалі(?!) тэлеграмы Заходняй вобласьці аб выкліку іх на сацспаборніцтва ў той час, калі пошта даставіла яе адначасна з гэткаю-ж тэлеграмаю ў Наркамснаб, Белсадгароднціну, рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» і Беллёнсаюз, прычым апошнія прынялі ўжо адпаведныя захады па разгортваньні спаборніцтва.

Загадчык групы садгароднціны ў Белкаапсаюзе Зэлічонак, які назваў сябе адзінай адказнай асобай па загатоўках, толькі «выпадкова ўбачыў» у Наркамснабе тэлеграму Заходняй вобласьці і азнаёміўся з ёю.

Ведаючы, такім чынам, аб выкліку на сацспаборніцтва, Белкаапсаюз нічога не зрабіў, каб зараз-жа пабальшавіцку прыняць выклік і паўдарнаму ўзяцца за выкананьне пляну адгрузкі насеньня бульбы. Ён чакае, паводле слоў т. Зэлічонка, паказаньня. Гэта—замест таго, каб самому падумаць аб тым, як хутчэй і лепш разгарнуць сацспаборніцтва паміж загатоўчымі арганізацыямі як унутры БССР, так і з Заходняй вобласьцю.

Г.

АД РЭДАКЦЫІ: На запытаньні нашага супрацоўніка, як Белкаапсаюз мяркуе адгукнуцца на выклік, т. Зэлічонак адказаў:

«Какое ваше дело, как мы будем делать».

Наогул на шмат запытаньняў, якія датычыліся канкрэтнага выкананьня пляну адгрузкі бульбы ў сувязі з тэлеграмай Заходняй вобласьці, т. Зэлічонак вытрымліваў многазначна паўзу, або, у лепшым выпадку, адказаў гіранічным запытаньнем:

«Ну, а еще что?»

Лічачы запытаньні газэты, якая, поруч з іншымі прымае ўдзел у сацспаборніцтве, судовым дазнаньнем (?), т. Зэлічонак па бюракратычнаму, зьвысока аднесься да жаданьня газэты дапамагчы хутчэйшаму выкананьню пляна навых заданьняў, мабілізаваць вакол сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю шырокія масы рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Нарэшце, выраз т. Зэлічонка аб тым, што—**вы можаце напісаць пра мяне ў газэту, адкрывае ўсю сутнасьць агідных адносін Зэлічонка да ўсёй гэтай справы.**

Што гэта такое? Бюракратызм, боязьць крытыкі, ці апартуністычная недаацэнка важнасьці сацспаборніцтва і ролі друку ў гэтым пытаньні?

Мы ўпэўнены, што адпаведныя арганізацыі і савецкая грамадзкасьць дадуць належную кваліфікацыю гэтаму агіднаму выпаду з боку Зэлічонка.

Плян бульбазагатовак павінен быць выканан у тэрмін

Белсадгароднціна і Белкаапсаюз прапалі самы гарачы час для адгрузкі і загатовак бульбы.

Сярод падрыхтоўчых работ да веснавой пасэўнай кампаніі вялікую ролю адыгрываюць міжвобласныя і міжраённыя перакідкі насеньня.

З БССР пакана быць зараз адгружана ў інш. раёны Савецкага Саюзу 61.600 тон бульбы у тым ліку 21.200 тон насеннай. У многіх раёнах Савецкага Саюзу сяўба ўжо праводзіцца. Вось чаму пытаньню адгрузкі бульбы з межаў БССР павінна быць нададзена самая сур'ёзная ўвага.

Другім ня менш важным пытаньнем зьяўляюцца ўнутраныя загатоўкі і перакідкі бульбы для забясьпечаньня рабочых цэнтраў БССР.

Ня гледзячы на тое, што амаль месяц мінуў з таго часу, як можна было пачаць загатоўкі і адгрузку бульбы, у гэтай галіне да апошняга часу нічога амаль ня зроблена.

На 11 красавіка плян веснавых загатовак бульбы выкананы ледзь на 0,4 проц. Ня лепш абстаіць справа з адгрузкай бульбы за межы БССР; па гэтае-ж чысло плян адгрузкі бульбы выкананы толькі на 1 проц.

Белкаапсаюз плян адгрузкі бульбы выканаў на 1,1 проц., Белільнасаюз—на 0,4 проц.

Пададзеныя лічбы характарызуюць зусім неадзалыняючыя тэмпы работы па загатоўках і адгрузцы бульбы. У правядзеньні гэтага найважнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства нашы цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі праявілі поўную нядбайнасьць.

Па лініі Белсадгароднціны, арганізацыі, якая павінна плянаваць і кантраляваць загатоўкі і адгрузкі бульбы, своечасова ня была мабілізавана ўвага апарату міжраённых кантор на правядзеньне гэтых мерапрыемстваў. Апарат Белсадгароднціны проста бязьдзейнічаў. Наркамснаб паслаў мясцоцм шмат дырэктыў аб пасіленьні загатовак і адгрузкі бульбы. Але-ж мала толькі паслаць дырэктыву. Трэба яшчэ наладзіць і арганізаваць кантроль, як праводзяцца ў жыцьцё тэмпы дырэктывы. Ці здолела гэта зрабіць Белсадгароднціна? Не, ня здолела. Міжраённыя канторы Белсадгароднціны у **Мозыры, Гомлі, Віцебску, Полацку і Бабруйску** бязьдзейнічаюць.

Таксама нічога ня робіцца па загатоўках і адгрузцы бульбы па лініі Белкаапсаюзу і Белільнасаюзу. Праўленьні Белкаапсаюзу і Белільнасаюзу ня прынялі адпаведных захадаў, каб дабіцца ад сваёй нізоўкі пералому ў бульбазагатоўках. Нізоўка гэтых сыстэм зусім бязьдзейнічае, што і было адзначана на калегіі Наркамснабу ад 9-га красавіка. Пасобныя працаўнікі БКС і БІС проста сабатуюць загатоўкі і адгрузку бульбы, спасылаючыся на тое, што яшчэ холадна, каб адкрыць капцы, што трэба яшчэ пачакаць і г. д. Замест таго, каб арганізаваць вываз бульбы да чыгуначных станцый па сапраўднай дарозе—БКС і БІС разважаюць і чагосьці чакаюць т. т. Баршай (БІС) і Зэлічонак (БКС), якія працуюць па загатоўках бульбы, недаацэньваюць становішча, у якім знаходзяцца бульбазагатоўкі; яны не прымаюць належных захадаў праз свае праўленьні, каб спыніць бязьдзейнасьць і самацёк нізоўкі.

Гэтыя арганізацыі павінны зараз-жа ўстанавіць жорсткі кантроль за работай нізоўкі, шляхам безадкладнага рэагаваньня на ўсе слабыя месцы ў рабоце.

У выніку апартуністычнай недаацэнкі загатовак і адгрузкі бульбы з боку загатоўчых арганізацый БССР ставіцца пад пагрозу выкананьне пляну сяўбы ў раёнах раньняй сяўбы. Учора ад «Укрплодовощ» атрымана тэлеграма наступнага зьместу: «Неаднаразовыя патрабаваньні адгрузкі насеннай бульбы Харкаву застаюцца без задавальненьня. Рашуча патрабуем тэрмінова грузіць бульбу, бо зрываецца раньняя сяўба. Паведамце аб адгрузцы».

Камэнтары тут не патрабуюцца.

Цэлы рад раёнаў да апошняга часу не надаюць належнай увагі загатоўкам і адгрузцы бульбы. Прадстаўнік Саюзнага Наркамснабу тав. **Гарасімаў** прыводзіць цэлы рад фактаў, якія характарызуюць нядбайныя адносны з боку раённых арганізацый да бульбазагатовак. У **Аршанскім, Дубровенскім, Коханаўскім, Круглянскім і Смалявіцкім** раёнах нічога ня робіцца па бульбазагатоўках. Раённы апарат не мабілізаваны на правядзеньне гэтай кампаніі. У пералічаных раёнах нават неаймоўкоўвалася дырэктыва ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб бульбазагатоўках. Таксама нічога ня зроблена па адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам у **Калінкавіцкім, Глускім, Парацкім, Бяльнецкім, Жлобінскім, Чэрыкаўскім, Рагачоўскім, Быхаўскім, Чачавіцкім, Касьцюковіцкім і Пятрыкоўскім раёнах.**

Мы сустракаемся з фактамі чыста злачынных адносін да захаваньня насеннай бульбы. Гэтымі днямі на станцыі Смалявічы па віне ўпаўнаважанага Чэрвенскага спажыўтаварыства. Папярніцкага памарозілі значную партыю бульбы. Бульбу прывезлі за 40 клм. (з Раваніцкага с.-с., Чэрвенскага раёну). Ад дажджу бульба памокла, яе ўсыпалі ў няўцеплены вагон, ноччу быў мароз, у выніку чаго памерзла 50 вазоў насеннай бульбы.

Там, дзе вакол пытаньня загатовак і адгрузкі бульбы мабілізавана грамадзкая думка, дзе мабілізаваны ўвесь партыйны і савецкі актыў, там гэтае мерапрыемства праходзіць адвальняюча. Так, **Расьнянскі раён** за два дні выканаў увесь плян па адгрузцы бульбы. Добра разгарнулася работа ў **Крупскім раёне. Лагойскі раён**, якому прыходзіцца далёка вазіць бульбу да чыгункі, плян адгрузкі бульбы канчае.

Мы сьлічаліваем аб тым, што пытаньню загатовак і адгрузкі бульбы не адводзіцца належнай увагі.

Палі чакаюць насеньня, пралетарскія цэнтры—прадуктаў.—БССР павінна выканаць свой абавязак перад пралетарыятам Савецкага Саюзу. Неабходна зараз-жа на ўсе пераклічыць работу па загатоўках і адгрузцы бульбы на ўдарныя тэмпы. Трэба абязьсіць рашучую барацьбу апартунізму і самацёку ў бульбазагатоўках.

У бліжэйшыя дні поўнасьцю закончыць адгрузку бульбы.

Антысавецкі фронт і Нямеччына

Цана, за якую фашысты Нямеччыны згодны прадацца

АДЧЫНЕНАЯ ЗАЯВА «ДЭР ЮНГ-ДЭЙЧЭ»

БЭРЛІН, 10 красавіка. Орган младанямецкага ордэна «Дэр Юнгдэйчэ» зьмяшчае паказальны па сваёй адкрытасьці перадавы артыкул дэпутата рэйхстага Абаля аб спробах Францыі ўцягнуць Нямеччыну ў антысавецкі фронт.

Абэль сьцьвярджае, што Францыя лічыць няўхільным заключэньне аўстра-нямецкага мытнага саюзу і таму стараецца вытаргаваць якую-небудзь кампэнсацыю ад Нямеччыны. Спачэтку французы патрабавалі ўрачыстага прызнаньня Нямеччынай вечнасьці палітычнай самастойнасьці Аўстрыі, потым спрабавалі атрымаць кампэнсацыю ў Саарскай вобласьці. Паводле апошніх паведамленьняў з Парыжа, там гатовы згадзіцца на ажыцьцяўленьне мытнага саюзу паміж Нямеччынай і Аўстрыяй пры ўмове актыўнага ўдзелу Нямеччыны ў арганізуемым Францыяй фронце супроць СССР.

Далей Абэль піша: «Ужо на працягу некалькіх тыдняў Парыж з вялікім напружаньнем чакае зьвестак аб тайных папярэдніх перагаворах, якія быццам адбываюцца паміж Нямеччынай і Савецкім саюзам адносна аднаўленьня Бэрлінскага дагавору. У Парыжы баяцца, што Нямеччына ня толькі адновіць гэты дагавор, але і палітычна значна пашырыць яго. Створаная Брыянам у Нямеччыне арганізацыя атрымала падрабязныя інструкцыі праверыць усё—нават самыя нязначныя палітычныя групоўкі Нямеччыны і высьніць іх адносіны да Савецкага саюзу, а таксама па магчымасьці зрабіць уплыў на іх у выгодным для французкай палітыкі кірунку. Для таго, каб перашкодзіць аднаўленьню Бэрлінскага дагавору, французы ўдуць дыплёматычную і палітычную кампанію, накіраваную да таго, каб дыскрэдытаваць Савецкі саюз і скаваць палітычнае і ваеннае колца вакол СССР. У Румыніі робіцца спроба распус

МТС--на перадавыя пазіцыі другой бальшавіцкай!

23 МТС БССР выканалі плян па заключэньні дагавароў з калгасамі толькі на 88,6 проц.

Перавыканалі свае пляны: Амсьціслаўская, Смалявіцкая, Клімавіцкая, Койданаўская, Танеская, Горацкая, Шклоўская, Слуцкая, Лёзьнянская, Лепельская, Церахоўская, Дубровенская МТС

Плятуцца ў хвасьце: Асьвейскаая, Ушацкая, Жыткавіцкая Гарадокская і Ветрынская МТС

Насенны фонд па раньніх культурах МТС утворан на 91,1 проц. пляну, а па позьніх толькі на 67,2 проц.

МТС яшчэ не разгарнулі належнай работы па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну, не ліквідавалі ў сябе абязьлічкі

Перад выхадам у поле

Інфармацыйныя паведамленьні, якія паступаюць з МТС аб выніках дню праверкі гатоўнасьці да веснавой сяўбы ў МТС і калгасах, якія абслугоўваюцца імі, і агляд цэнтральнага і раённага друку за апошні час прымушаюць нас біць трывогу і сыгналізаваць аб недастатковай падрыхтаванасьці да сяўбы ,як калгасаў, якія будуць абслугоўвацца трактарным паркам МТС, так і саміх МТС.

Амаль ні ў адным калгасе поўнасьцю яшчэ не адрамантаваны і канчаткова не прыстасованы інвэнтар для выезду па першаму сыгналу ў поле, а кожны вытворчы плян МТС шчыльна ўвязваецца з поўным скарыстаньнем жывога і мёртвага інвэнтара калгасу).

У шмат калгасах ня створаны насенны і кармавы фонд, ня складзены рабочыя пляны, не ачышчана насеньне, не пранрацован і не ўстаноўлен парадак дастаўкі харчоў трактарыстам у поле. Няма таксама выразнай дагаворанасьці з райздравамі аб мэдабслугаваньні, аб арганізацыі ясьляў, аб кінаабслугоўваньні праз каапэрацыйную сыстэму.

Радыёўстаноўкі, якія маюцца ў шмат калгасаў і камунах, не працуюць, стаяць зануленымі, без батарэй, і ня прымаюцца меры да прывядзеньня іх у парадак.

Па саміх МТС трактары, якія ўжо разьвезены па калгасах, дасканала не праверены. Прычэпны інвэнтар ляжыць яшчэ амаль так, як ён прыбыў з заводу, г. зн. яшчэ не сабраны (пры зборцы выяўлены таксама папсаваныя часткі). Не ва ўсіх МТС скончана дагаворная кампанія, не ўдасканалены вытворчыя пляны (ў выглядзе плянаўкарт з паказаньнем маршрутаў заезду трактараў). Дагэтуль яшчэ грамадзкая думка калгасьнікаў і трактарыстаў не мабілізавана вакол пытаньня аб бережлівых адносінах да трактара і прычэпнага інвэнтара, аб ліквідацыі абязьлічанай язды на трактары, аб нормах выпрацоўкі, зьдзельшчыны і разьмеркаваньне прыбыткаў не па душах, а па працаднях.

У зьвязку са спазьненьнем вясны, мы можам трапіць у такое становішча, што час сяўбы надыйдзе раптам, а пры такіх нездавальняючых тэмпах падрыхтоўкі да яе, МТС можа быць захоплена зьнянацку, і тады нямінуча буйныя прарывы ў выкананьні пляну другой бальшавіцкай вясны.

Неабходна мець на ўвазе яшчэ і тое, што позьні пачатак сяўбы ні ў якім разе не павінен пацягнуць за сабой позьняе скончэньне яе. Пасеўную кампанію прыдзецца ўсё роўна скончыць не пазьней тых тэрмінаў, якія вызначаны па раёнах, а г. зн., што праца павінна будзе весьціся МТС яшчэ больш хуткімі і ўдарнымі тэмпамі, а гэта ў свою чаргу патрабуе яшчэ большай падрыхтаванасьці і арганізаванасьці.

Гэтыя абставіны патрабуюць з боку кожнай МТС, вялікай гібкасьці, актыўнасьці і ініцыятывы ў справе падрыхтоўкі да сяўбы.

Гэтыя пытаньні павінны паўстаць ня толькі перад МТС, але і перад усімі раённымі кіруючымі арганізацыямі, вакол гэтага пытаньня павінна быць мабілізавана грамадзкая думка ўсяго раённага актыву ,каб правесьці найлепшую падрыхтоўку да сяўбы як калгасаў, так і МТС.

Брандабоўскі.

Змагацца за перавыкананьне сустрэчнага

Мацней удар па апартуністых

Амсьціслаўская МТС пагодле пляну трактарацэнтру павінна заключыць дагаворы з калгасамі на 11.500 га плошчы ярыны і, апрача таго, па лёне на 2130 га. МТС, выходзячы з мясцовых умоў, высунала свой сустрэчны плян пад ярыны на 12.937 га, па лёне—на 2.205 га і канаплях—на 436 га.

Як-жа Амсьціслаўская МТС ажыцьцяўляе свой сустрэчны плян?

Да 25 сакавіка заключана 52 дагаворы, якімі ахоплена 72 калгасы з плошчай у 11.753 га.

Правакартуністычную практыку ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы праводзіць праўленьне Амсьціслаўскага Райкалгасаюзу, асабліва ў галіне ўвязкі сваёй работы з работай МТС. Вытворчыя пляны ў старых калгасах да 25 сакавіка складзены толькі на 80 проц., а па нанова арганізаваных калгасах і думаць пра складаньне пляну яшчэ не пачыналі. Справа насеньнаводзтва ў Райкалгассаюзе складаецца з 2-х кілё начытаных папер Райкалгассаюз лічыць не сваёй справай—сабраць вёскі для складаньня рабочых праграм МТС у разрэзе кожнага калгасу, нават ня хоча ў гэтым дапамагчы МТС.

Праўленьне райкалгассаюзу лічыла, што ў іх справа са складаньнем вытворчых пляну ў стаіць вельмі добра і прэміравала свайго агранома імянным гадзіньнікам. Між тым, гэты аграном праз некаторы час за бязьдзейнасьць аддаецца пад суд. Вучот і справаздачнасьць у райкалгассаюзе ад сутнічае. Афармленьне арганізуемых калгасаў праводзіцца вельмі марудныміі тэмпамі.

Для забесьпячэньня МТС кадрамі праводзяцца 4-х месячныя курсы, якімі ахоплена 232 чал. Камсамольская арганізацыя раёну ня толькі ня цікавіцца курсамі, а нават сам РК ЛКСМ ня ведае колькі на курсах камсамольцаў. На курсах адсутнічае дысцыпліна. Сярод асобных курсантаў наглядаецца п'янства.

Трэба неадкладна зьнішчыць усе недахопы, узяць у падрыхтоўцы да сяўбы сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Усе раённыя арганізацыі павінны прысьці на дапамогу МТС у выкананьні пастаўленых перад ёю задач.

Селькор П. В.

Трактары без прычэпнага інвэнтара ў Капыльскай МТС

Капыльская МТС абслугоўвае Капыльскі і частку Грэскага раёнаў. Свой плян па заключэньні дагавароў з калгасамі Капыльская МТС амаль поўнасьцю выканала.

Недалёка дзень, калі трактары павінны выйсьці на палі, але ў МТС дагэтуль не хапае прычэпных машын, асабліва плугоў, і гэта ня гледзячы на тое, што аб гэтым некалькі разоў даводзілася да ведама Белкалгасцэнтру.

Ня лепш стаіць справа і з запаснымі часткамі: не хапае шмат аўтаматаў і ўтулак для плугоў і інш. прылад.

У заключэньні трэба сказаць, што тэрыторыя, на якой будуецца Капыльская МТС, ляжыць далёка за мястэчкам. Плошча немаленькая—займае 22 га, будзе шмат драўляных будынкаў, а забесьпячэньне МТС вадой будзе зусім дрэннае. Калодзеж будуецца просты і на адным баку тэрыторыі, што зьяўляецца небясьпечным, бо вады будзе вельмі мала на ўсю МТС.

Пакуль ня позна трэба выправіць усе адзначаныя недахопы і не запамятаць забесьпечыць МТС вадой.

Пост-брыгадзір. «Сав. Бел.» Песачанскі.

Рыхтуемся па-ўдарнаму да другой калгаснай

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны па некаторых мясцох Сьмілавіцкага раёну праходзіць па ўдарнаму. Па калгасах праведзена растлумачальная работа аб задачах кампаніі. Закончваецца ачыстка насеньня, праводзіцца рамонт сельска-гаспадарчых машын. У рамонце аказваюць вялікую дапамогу рабочыя шэфы заводу «Камунар».

У раёне маецца аддзяленьне МТС на 50 трактараў. Арганізаваны курсы трактарыстаў, якімі ахоплены каля 70 чал. Да выхаду ў поле яны будуць падрыхтаваны.

Работа па падрыхтоўцы да сяўбы ў Дукорскім сельсавеце ў разгары. Па ўсіх калгасах праведзена растлумачальная работа і ачыстка насеньня, зараз рамантуецца сельска-гаспадарчы інвэнтар. За апошні час па сельсавеце арганізавана 4 новых калгасы, маецца значны прыліў ў існуючыя калгасы. Першым у падрыхтоўцы да сяўбы ідзе калгас імя «16 партызан».

М. Піскун.

Галавацяпства ці шкодніцтва?

Калгас імя Сталіна (Полацкі раён) нядаўна набыў сабе трактар. Для пакупкі яго былі мабілізаваны сродкі грамадзкасьці. Так, напрыклад, была сабрана значная сума грошай памж настаўнікамі і вучнямі ШКМ, чыгуначнікамі, калгасьнікамі і нават адпаасобнікамі. Ставіліся спэктаклі, арганізоўваліся лётарэі, словам выкарыстана бы ло ўсё магчымае, каб да веснавой сяўбы набыць калгасу трактар.

Трактар быў куплен, але ён папаў пад апеку такіх людзей, якія пастараліся да веснавой сяўбы прывесьці яго ў нягоднасьць.

У чым - жа справа?

Калгас задумаў устанавіць прымітыўную лесапілу з цягавай сілай трактара. Калгасьнік-трактарысты, які скончыў 6-ці месячныя курсы папрасіў даць яму стаўку вышэй разрадам, чым звычайнаму рабочаму. Розьніца пут у капейках. Але праўленьне, асабліва старшыня яго Ткачоў катэгарычна ад новіўся падвысіць гэтую стаўку. Ткачоў даручыў тады трактар зусім несьвядомаму чалавеку, які папсаваў яго.

Застаецца зусім не зразумелым, чаму трактар псаваўся на вачох Праўленьня, а старшыня апошняга нават даваў распараджэньні па ўчыненьне яўнага шкодніцтва.

Напрыклад, пры ўстаноўцы трактара каля варштату лесапілкі выпадковы «трактарыстыі» ня сумеў зьняць зад няга кола, каб адзець шкіў. Тады па распараджэньню Ткачова каваль падпіліваў на палову вобад каляса, выняў цэлую пласьцінку і... ўставіў шкіў. Досыць цяпер папасьці калясу на камень, альбо пень, як яно зусім зломіцца. Па другое, у трактары аказаліся чамусьці няправільна прыгнаны некаторыя часткі мэханізму. Пры пуску трактара ў работу, ніхто не паклапаціўся яго абгледзіць. Пушчаны ў ход трактар падаваў выразныя адзнакі аб ненармальнасьці ў рабоце. Аб гэтым рабілі заўвагі старшыні, але зноў-жа з боку адміністрацыі ніхто не рэагаваў. У выніку цыліндр у трактара папсаваўся і ён перастаў працаваць. Цяпер стаў, трактар, стаіць і лесапілка, а палявыя работы не за гарамі.

Гэты факт яскрава сьведчыць аб тым, як некаторыя калгасныя адміністратары з злачыннай нядбайнасьцю адносяцца да грамадзкай маёмасьці, ставячы пад пагрозу веснавую сяўбу ў калгасе. Факты гэтыя трэба расьледзваць і вінаватых пакараць па заслугах.

П. Н-скі.

Заключылі дагавор з МТС

У адказ на вылазку кулакоў і падкулачнікаў, якія імкнуліся разваліць калгас, калгасьнікі калгасу «Барацьба» (Шклоўскі раён) па ўдарнаму ўзяліся за падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Ужо заключаны дагавор з МТС, вядзецца ачыстка насеньня, створаны на сенныя фонды. За апошні час у калгас уступіла новых 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Селькор. Я.

Аперацыйная сводка другой бальшавіцкай

Сталёвая коньніца перад выхадам у поле

Паводле даных Беларускага аддзяленьня Трактарацэнтру на 10 красавіка беларускімі машына-трактарнымі станцыямі заключаны дагаворы з 1140 калгасамі.

За першую дэкаду красавіка ўсімі МТС заключаны дагаворы з 79 калгасамі. Такім чынам, за гэту дэкаду ў параўнаньні з апошняй дэкадай сакавіка тэмп значна павялічыўся, але яшчэ недастаткова. (У апошнюю дэкаду сакавіка былі заключаны дагаворы з 45 калгасамі).

Заданьне па плошчы пасеваў яравых па 23 МТС выканана толькі на 88,6 проц. і пад лён—на 75 проц.

Свае пляны перавыканалі наступныя МТС:

Амсьціслаўская плян выканала на 119,3 проц., Смалявіцкая на 116,5%, Клімавіцкая—на 114,2 проц., Койданаўская павялічаны плян—на 113,4 проц., Танеская—на 112,4 проц., Горацкая—на 110,3 проц., Шклоўская—на 106,9%, Слуцкая—на 105,7 проц., Лёзьнянская—на 105,6 проц., Лепельская—на 103,9 проц., Церахоўская—на 101,4 проц. і Дубровенская—на 100,6 проц.

Нездавальняючыя тэмпы паказваюць: Ветрынская МТС, якая выканала свой плян толькі на 70,8 проц., Гарадоцкая—на 70,5 проц., Жыткавіцкая—на 71,2 проц., Вушацкая—на 63,8 проц.

Зусім дрэнна выковае свой плян Асьвейская МТС,—53,6 проц.

Насенны фонд па раньніх культурах у сярэднім усімі МТС сабраны толькі 91,1 проц. пляну. Яшчэ горш з утварэньнем насеннага фонду па позьніх культурах, па якіх плян выканан усяго на 67,2 проц.

Паводле вестак на 1 красавіка плян рамонту трактароў выканан па машына-трактарных станцыях на 96 проц. і па калгасах толькі на 67,5 проц.

Сакавікоўская норма завозу гаручага выканана поўнасьцю. За красавік месяц гаручае паступае вельмі слаба, але канкрэтных даных у аддзяленьні Трактарацэнтру няма.

Як гэта ня дзіўна, але ў Беларускім аддзяленьні Трактарацэнтру дагэтуль няма амаль ніякіх вестак аб выніках праверкі гатоўнасьці МТС да выхаду ў поле. Між тым, праверка па МТС праводзілася 25 сакавіка.

Дапамагчы Слуцкай МТС сустрэць вясну ва ўсеўзброеньні

Слуцак (наш. карэсп.). Да гэтага часу Слуцкая МТС не забясьпечана неабходнай колькасьцю трактароў. Трактарнага інвэнтара таксама няма за выключэньнем плугоў, але і іх недастатковa. Трактарных счэпак да трактароў «Фардзон» няма, а ёсьць яны толькі да трактару «Інтэрнацыянал». Між тым, МТС апошніх мае вельмі мала.

Ні кіраўніцтва МТС, ні райком партыі, ні райвыканком дагэтуль не зацікавіліся падшуканьнем тары, якая зусім адсутнічае, з складчымі памяшканьнямі справа ня лепш. Сельска-гаспадарчы інвэнтар раскіданы ў розных мясцох, а часткова і пад адкрытым небам. Ахова маёмасьці не наладжана. Не наладжана культмасавая работа сярод калгасьнікаў, ударніцтва не разгорнута.

МТС яшчэ не ахапіла дагаворамі мэліяратыўныя таварыствы. Горш за ўсё стаіць справа з вывазкай будаўнічага матар'ялу, замест 1200 куб. мэтр. вывезена толькі 400 куб. мэтр.

На зьнішчэньне ўсіх гэтых недахопаў трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Мясцовыя партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны дапамагчы МТС сустрэць вясну падрыхтаванай.

А. Курдо.

Забясьпечыць тэхнічным абслугоўваньнем трактарны парк калгасаў

(Інтрукцыя па тэхнічным абслугоўваньні трактарнага парку калгаснага сэктару)

Для забясьпечаньня тэхабслугоўваньнем трактарнага парку калгаснага сэктару, прапануем кіраўцам наступным:

1. МТС або рамонтныя майстэрні, да якіх прымацавана больш 10 трактароў, вылучаюць аднаго разьязднога мэханіка, утрыманьне якога ўлічваецца асобна па рахунку выдаткаў па тэхдапамозе.

Тым-ж МТС, або рамонтныя майстэрні, да якіх прымацавана менш 10 трактароў, асобнага мэханіка ня вылучаюць, а пасылаюць па выкліку аднаго з мэханікаў, адносячы яго ўтрыманьне за час паездкі на рахунак тэхдапамогі.

2. Вылучаныя мэханікі зьяўляюцца сталымі супрацоўнікамі ў штаце МТС, або рамонтнай майстэрні і ў вольны ад выездаў час скарыстоўваюцца па прызначэньні.

3. Вылучаныя мэханікі павінны быць забясьпечаны неабходнымі пры выездах спрымантамі.

4. На вылучанага мэханіка ўскладаецца:

а) рамонт трактароў калгаснага сэктару, вышаўшых са строю, калі гэта магчыма зрабіць на месцы, у працёўным выпадку мэханік дае ўказаньне, куды павінен быць накіраваны трактар для рамонту;

б) пры наведваньні трактарнай гаспадаркі правяраць кваліфікацыю трактарыстаў і даваць указаньні па пытаньнях эксплёатацыі трактара і прычэпнага інвэнтара;

в) праверыць вучот і выдаткаваньне гаручага і смазачных масел, а таксама даваць указаньні аб эканомным і правільным выдаткаваньні апошніх;

г) па скончэньні палявых работ, мэханік складае дэфэктныя ведамасьці на кожны абслугоўваемы ім трактар, а там, дзе маюцца калёнаважатыя, правярае правільнасьць складаньня дэфэктных ведамасьцяй і дае ўказаньні куды і як накіраваць трактары ў рамонт;

д) выяўляць і весьці вучот усяго с.-г. інвэнтара і абслугоўваемых гаспадарак на прадмет скарыстаньня гэтага інвэнтара пры арганізацыі новых МТС;

ж) весьці нагляд за правільным выдаткаваньнем запасных частак, не дапушчаючы накапленьня дэфіцытных частак у аднэй гаспадарцы і пры выяўленьні ліпкаў у аднэй гаспадарцы і недахопу ў другой рабіць перакідку.

5. Вылучаны мэханік выяжджае ў калгас толькі па выкліку апошняга, а пасьля кожнай кампаніі робіць пэрыядычны аб'езд і абсьледваньне, прычым, калгасы ва ўсіх выпадках павінны прадстаўляць сродкі перасоўваньня і аплачваць увесь кошт праезду (чыгуначны тарыф, аўтамабіль, фурманка і іншыя віды транспарту).

6. Пры выездах мэханік павінен мець пры сабе разьязны ліст, у якім гаспадарка робіць адзнаку аб часе прыбыцьця і выбыцьця мэханіка і аб праробленай ім у гаспадарцы рабоце.

7. Запасныя часткі, неабходныя для рамонту прымацаваных трактароў, адпушчаюцца выключна праз аднаведныя МТС, або рамонтныя майстэрні, або па іх заяўках Белсельгасснабу.

8. Ніякі водпуск запасных частак па патрабаваньні асобных трактарных гаспадарак Белсельгасснабам ня робіцца.

9. Выдача і замена буйных запасных частак робіцца толькі па ўказаньнях і пад кіраўніцтвам мэханіка. Сама стоўна ад МТС або рамонтных майстэрняў гаспадарка атрымае толькі дробныя часткі (пласьцінкі, мосьцікі, вібратары, ролік і кажух камутатара і інш.).

10. Запасныя часткі выдаюцца з МТС або рамонтнай майстэрні толькі за на яўны разьлік па цэнах рахункаў Белсельгасснабу плюс фрахт.

11. Гаручым і смазачным, а таксама матар'ялам для рамонту, выключаючы бэбіт і волава, калгасны сэктар забясьпечваецца самастойна па сваіх заяўках.

Упаўнаважаны Беладдзяленьня Трактарацэнтру КАМАЕЎ.
Тэхн. інспэктар ШМІДТ.
12 красавіка, 1931 г. г. Менск.

Калгас „Новае Жыцьцё" ўключыўся ў двухдэкаднік генэральнай праверкі

Камаравіцкі сельсавет, Пятрыкоўскага раёну ўключыўся ў двудэкаднік генэральнай праверкі. Складзены ныя брыгады з сельсавецкага актыву, настаўніцтва. На агульных сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў арганізаваны пяцёркі па праверцы падрыхтаванасьці да сяўбы калгасаў і аднаасобнікаў, а таксама па вырбоўцы новых калгасьнікаў.

У калгас «Савецкая Беларусь» у часе праверкі завербавана 3 гаспадаркі, у калгас «Новае Жыцьцё»—4 гаспадаркі.

6 красавіка калгас «Новае Жыцьцё» зрабіў пробны выезд у поле. Калгас паказаў поўную падрыхтаванасьць. Усе калгасьнікі, як адзін, выйшлі ў поле. Цягавая сіла, збруя, сельска-гаспадарчыя машыны і інш. аказаліся ў спраўнасьці.

Пробны выезд калгасу нанёс руйну ючы ўдар кулаку і яго агентуры і паказаў прыклад аднаасобнікам балевой гатоўнасьці да 2-й бальшавіцкай.

Пост-брыгадзір «С. Б.» А. Паляненні.

Талочынскі і Азарыцкі саветы злачынна зрываюць падрыхтоўку да сяўбы

Дырэктывы партыі і ўраду ў пытаньні падрыхтоўкі да веснавой насеўкампаніі не знайшлі адпаведнага адбітку ў рабоце Талачынскага местачковага і Азарыцкага сельскага саветаў, Талачынскага раёну.

Пляны насеўкампаніі да паселішч і бядняцка-серадняцкіх двароў, у парадку самазабавязацельстваў, не даведзены і на сходах беднаты не абгаварваліся.

Страхавых фондаў не сабрана нават ні аднаго зерня. Кантрактацыя яравых пасеваў яшчэ не разгорнута. Зерняачышчэньне, абмен звычайнага насеньня на сартавое, рамонт с.-г. машын і інвэнтара, збор попелу—ідуць самацёкам.

Нічога ня робіцца і ў адносінах калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Азарыцкі сельсавет яшчэ ня прыступіў да ссыпкі страхавых фондаў. Трэба, каб гэтыя саветы зараз-жа разгарнулі аднаведную работу па падрыхтоўцы да сяўбы, па далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і вытворчым каапэраваньні, увязваючы гэту работу з усімі праходзячымі зараз гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

С. Л.

Па-баявому ліквідаваць недахопы

Новая Слуцкая машына-трактарная станцыя па баявому разгарнула работу па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

Праведзеная 26-га сакавіка аднадзенная праверка гатоўнасьці МТС да сяўбы выявіла, што за кароткі тэрмін свайго існаваньня (пачала працаваць з 15 лютага), МТС ужо прарабіла вялікую работу па падрыхтоўцы да сяўбы і асабліва ў галіне падрыхтоўкі новых кадраў. МТС ужо ў асноўным скончыла дагаворную кампанію з калгасамі. У радзе месц гэта кампанія выклікала моцны калгасны прыліў. Шмат новых дзесяткаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уступілі ў калгасы.

Ужо складзен агульны вытворчы плян работы машына-трактарнай станцыі. Пры МТС шырока разгорнута падрыхтоўка маладых рулявых і паляводаў. Асноўнымі работнікамі і спэцыялістамі МТС ўкамплектавана.

Усё-ж трэба сказаць, што ў справе баявой гатоўнасьці да выезду ў поле патрабуецца яшчэ вялікая, сапраўды ўдарная работа. З 55 трактараў, якія МТС павінна мець, у яе распараджэньні пакуль што ёсьць толькі 11. Трактарацэнтр яшчэ канчаткова не разнарадзіў трактараў. Частка сельска-каспадарчага інвэнтара, як сеялкі, жаткі і граблі, а таксама і ўвесь конны інвэнтар ляжыць яшчэ разабраным. Прыступаць да зборкі яго немагчыма з-за адсутнасьці складаў. 51 плуг, якія мае МТС, ужо паўнасьцю гатовы да работы. Кепска тое, што яшчэ канчаткова не ўстаноўлены вытворчыя вучасткі дзейнасьці МТС, ня складзены вытворчыя пляны ў калгасах, не наладжана вытворчае абслугоўваньне калгасаў спэцыялістамі, не пранрацавана пытаньне аб арганізацыі працы ў калгасах.

Кепска стаіць справа і з забесьпячэньнем МТС будаўнічым матар'ялам, а таксама з тарай для гаручага і смазачнага матар'ялу.

Усе паказаныя недахопы павінны быць неадкладна ліквідаваны. МТС па вінна атрымаць усямерную дапамогу ў рабоце з боку раённых устаноў і арганізацый.

Трэба прыняць усе меры да таго, каб сталёвыя коні Слуцкай МТС выехалі на фронт другой бальшавіцкай сяўбы добра ўзброеныя.

Л. Хаўкін.

„Дапамога" Ельскага райпрамсаюзу калгасам

Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара ў Ельскім раёне праходзіць марудна. Райвыканком усклаў рамонт інвэнтара на Ельскі райсампрамсаюз. Райсампрамсаюз-жа праз меру павялічыў цэны за рамонт як плугоў, так і вазоў. Зразумела, калгасы адмаўляюцца ад такой «дапамогі» райсампрамсаюзу і ў большасьці рамантуюць плугі і сельска-гаспадарчы інвэнтар у вандроўных кавалёў.

Арцелі райсампрамсаюзу вырабляюць розныя шорніцкія прылады, але зноў цэны райсампрамаўскія. У выніку калгасы гэтымі прыладамі да веснавой сяўбы не забясьпечаны.

Трэба прымусіць бюракратаў з райсампрамсаюзу павярнуць твар да 2-й бальшавіцкай вясны не на словах, а на справе.

Райсельскараўскі пост «Сав. Бел.»

На Аршаншчыне акцыі Трактарацэнтру не рэалізуюцца

Сучаснае наліччa 89 калгасаў па Аршанскаму раёну, сярод якіх маюцца да волі буйныя па плошчы пахаці, як напрыклад, «Ларыньўка», «16 партызьезд», імя ЦВК БССР, «Новая Зара», «Шлях да сацыялізму», камуна «Х Кастрычнік» і г. д., пасьляховае разгортваньне калгаснага руху ў раёне, стварае настойлівую патрэбу ў такой моцнай машыннай базе і цягавай сіле, як МТС. А калі да гэтага яшчэ дадаць сем даволі буйных саўгасаў і прыгарадныя гаспадаркі ЦРК, ТПО і каапэратыў БелДРЭС'у, то бязумоўна, што без машына-трактарнай станцыі раёну ні ў якім разе не абыйсьціся. Значная частка калгасу (асабліва буйныя) не забясьпечаны цягавай сілай.

Партыя дала задачу раёну да вясны гэтага году калектывізаваць ня менш 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а да восені—50 проц. Зразумела, што пры наліччы сярод бядняцка-серадняцкіх мас цягі ў калгасы, гэта дырэктыва будзе раёнам выканана шляхам разгортваньня масавай растлумачальнай работы. А гэта яшчэ раз ставіць пытаньне аб пабудове ў раёне МТС, якая зьявіцца ня толькі вялізарнейшай дапамогай самім калгасам і саўгасам, але, галоўным чынам, яна зьявіцца моцным рухавіком у справе разгортваньня калгаснага руху. Яна прымусіць тых беднякоў і сераднякоў, якія яшчэ сёньня хістаюцца,—пераканацца ў пераважнасьці калгаснай гаспадаркі і пайці ў калгасы. Усё гэта разам ставіць пытаньне аб пабудове МТС у Аршанскім раёне, ня толькі перад урадам БССР, але і перад самімі калгасамі раёну. Яны павінны разгарнуць работу па мабілізацыі сродкаў на МТС, па рэалізацыі акцыі Трактарацэнтру. Ад пасьпяховага збору сродкаў будзе залежыць і пабудова ў нашым раёне МТС.

Як-жа аднесьліся да гэтага нашы калгасы? Зусім няўважліва і нядбайна. Замест вызначаных па пляну 29.000 р. акцый Трактарацэнтру рэалізавана значна менш. Тлумачыцца гэта тым, што ні Райза, ні Райкалгассаюз, ні Райбанк па рэалізацыю акцый Трактарацэнтру, на барацьбу за МТС, у нашым раёне не зьвярталі належнай увагі. Гэта работа праходзіла самацёкам.

Такое становішча ў далейшым зусім недапушчальна. Барацьба за МТС у нашым раёне, за рэалізацыю акцый Трактарацэнтру павінна быць разгорнута зараз-жа. У гэту работу павінны быць уцягнуты партыйныя і камсамольскія арганізацыі, шэфы, а ў калгасах павінны быць створаны камісіі садзейнічаньня будаўніцтву МТС. Паміж калгасамі павінна быць разгорнута сацыспаборніцтва па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Толькі пры ўмовах пасьляховага разгорнутай масавай работы за МТС, мы зможам дабіцца пабудовы ў нас МТС.

А. К.

У Парыцкім раёне не клапоцяцца аб рамонце інвэнтару

У Кар.-Слабодзкім сельсавеце Парыцкага раёну пагражаючае становішча з рамонтам сельска-гаспадарчага інвэнтару. Ня гледзячы на тое, што да сяўбы засталося вельмі мала часу, у гэтай галіне нічога ня зроблена. СКУ арганізаваў кузьню, але апошняя не працуе. РВК дакляраваў даць жалеза і прысылаць каваля, але ні адно, ні другое ня выканана.

Трэба, каб Парыцкія раённыя арганізацыі тэрмінова наладзілі рамонт с.-г. інвэнтара ў Кар.-Слабодзкім сельсавеце.

К. Хвядорскі.

Зьдзельшчына павінна быць!

Яшчэ ў часе асеньняй ўборачнай кампаніі ў саўгасе Дукора, Сьмілавіцкага раёну, па ініцыятыве рабочага камітэту было ўзьнята пытаньне аб пераходзе на зьдзельшчыну. Гэтак было і зроблена. Уборка бульбы, корань плодаў і вікі праходзіла ўжо па цьвёрдых нормах выпрацоўкі.

Але знайшліся магільшчыкі зьдзельшчыны. Дырэктар саўгасу Карыцкі (за раз зьняты з работы) пры падтрымцы ні апартуністаў хацеў зьнішчыць зьдзельшчыну, называючы яе шкурніцтвам. На працягу ўсёй зімы на кожным сходзе паўставала пытаньне аб зьдзельшчыне. А між тым толькі дзякуючы зьдзельшчыне была своячасова скончана асеньняя ўборка. Ня гледзячы на пастанову 6-га ўсесаюзнага зьезду Саветаў, зьдзельшчына ў саўгасе яшчэ і на сёньняшні дзень ня ўведзена. Новай адміністрацыі разам з рабочым камітэтам трэба неадкладна шырока абгаварыць на сходах пытань не аб зьдзельшчыне і распрацаваць нормы выпрацоўкі, каб на веснавую сяўбу выйсьці ў поле цалкам падрыхтаванымі.

Брыгада «Сав. Бел.»: Раготка, Піскун Я., Крук, Куніцкі, Зяноўчык, Рэдзька і Крайко.

Больш увагі зьдзельшчыне!

Як у раней арганізаваных, так і ў новых калгасах па сельсаветах Халопеніцкага раёну не прыступлена да пераходу на зьдзельшчыну.

Так, у Краснаслупкім сельсавеце ні ў адным калгасе яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына. Калгасы дзейна рыхтуюцца да 2-й бальшавіцкай вясны, але ня ўмеюць па новаму правільнаму арганізаваць сваю працу, а сельсавет і райкалгассаюз не дапамагаюць калгасам.

Калгасьнікі самі панынаюць абгаварваць пытаньне зьдзельшчыны, але су стракаюцца з радам арганізацыйных пытаньняў, якіх ня могуць самі вырашыць. Некаторыя калгасы як «Ударнік», імя Ільліча, вёсак Бардзілава, Галадкі і інш., ня раз зьвярталіся ў сельсавет за дапамогай, як наладзіць у іх зьдзельшчыну, але гэтай дапамогі не атрымалі. Райкалгассаюз закапаўся ў сваіх бюракратычных справах. Ён «вырашае пытаньне» з упнаеньнем і інш., зусім пакінуўшы ў баку зьдзельшчыну.

Камсамол Халопеніцкага раёну практычна не дапамагае калгасам ў пераходзе на зьдзельшчыну.

Па многіх вёсках кулакі і падкулачнікі агітуюць супроць зьдзельшчыны. Гэтая кулацкая агітацыя павінна атрымаць руйнуючы адпор.

Шэмпель.

Калгасныя масы—за зьдзельшчыну

Аднагалосна прынялі зьдзельшчыну калгасьнікі калгасу імя «16 партызан», Сьмілавіцкага раёну. Гэты калгас дасіоль працаваў падзённа, што ставала шмат недахопаў і зьвіхаў у рабоце.

Зараз пры пераходзе на зьдзельшчыну ўсе недахопы зьнішчаюцца. Калгасьнікі пры новых мэтадах работы ўзьнімаюць свой творчы энтузіязм і павышаюць прадукцыйнасьць працы. —Зьдзельшчына правільна арганізуе працу, правільна расстаўляе рабочую сілу і дае вялікую эфэктыўнасьць работы,—так заяўляюць калгасьнікі.

Брыгада «Сав. Бел.»: Куніцкі, Піскун, Рэдзька, Крайко і Зяноўчык.

Зьдзельшчына ўзьняла працоўную дысцыпліну

Калгасы «Бальшавік» і «Мэркуры»—маладыя калгасы. Яны арганізаваліся толькі некалькі месяцаў таму назад і адразу ўзяліся за практычнае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў аб зьдзельшчыне. Абгаварыўшы дасканала нормы выпрацоўкі на пасяджэньнях праўленьняў, гэтае пытаньне было перанесена на агульныя сходы членаў калгасу. Доўга гутарылі калгасьнікі на сходах, усебакова абгаварвалі нормы выпрацоўкі, ацэньвалі каштоўнасьць правядзеньня ў жыцьцё зьдзельшчыны.

Супроць ня было нікога. Зьдзельшчына аказалася ўведзенай па большасьці галін працы. І цяпер самі калгасы і калгасьнікі ўбачылі пераважнасьць зьдзельшчыны, перад падзённым разьмеркаваньнем аплаты. Калгасьнікі разважаюць:

— Бывала пойдзем касіць, я іду два пракосы, а мой сусед за гэты час толькі спраўляецца скасіць адзін пракос. Плату-ж атрымоўвалі аднолькавую.

Апошнія дні падрыхтоўкі да сяўбы паказалі яшчэ больш яскрава пераваг насьць зьдзельнай працы. У калгасе «Мэркуры» выбіралі бульбу з склепу. Бульбы трэба было выбраць 400 пудоў, куды было паслана 8 чалавек. Бульба аказалася выбранай за тры гадзіны працы 8 рабочымі.

— А раней? Раней-бы калупаліся над тэтаю бульбаю два дні.

Езьдзілі нядаўна калгасьнікі калгасу «Мэркуры» ў лес секчы калы для платоў. Кожнаму калгасьніку была дадзена норма—высеч 60 калоў. Гэтая праца была выканана на працягу аднэй гадзіны. Пры ранейшай працы, без зьдзельшчыны, гэтая праца была-б выканана на працягу цэлага дню.

Па возцы саломы ў калгасе «Бальшавік» да ўвядзеньня зьдзельшчыны на адлегласьці паўтара кілёмэтра саломы вывозілася 2 вазы ў дзень. Пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны за дзень калгасьнікі сталі вазіць па 5-6 вазоў саломы на той-жа адлегласьці.

У калгасах ідзе шпаркая падрыхтоўка да пераводу ўсіх работ поўнасьцю на зьдзельшчыну. Зьдзельшчына паказала на практыцы сваю пераважнасьць, значна падняла вытворчасьць працы, узьняла зацікаўленасьць калгасьнікаў гаспадарчым жыцьцём калгасу, зьнішчыла прагулы, палепшыла працоўную дысцыпліну.

Тым калгасам, якія яшчэ не перайшлі на зьдзельшчыну трэба браць прыклад з калгасаў «Бальшавік» і «Мэркуры».

Брыгада «Сав. Бел.»: А. Дамброўскі, Парахневіч, Пімненаў.

Барысаўскі райкалгассаюз ня кіруе ўвядзеньнем зьдзельшчыны

Пераход калгасаў на зьдзельшчыну па асноўных галінах гаспадаркі павінен быць закончаны 15 красавіка. Даныя па калгасах Барысаўскага раёну гавораць аб тым, што да 16 красавіка практычная работа па ўвядзеньні зьдзельшчыны разгарнулася толькі па 17 калгасах з агульнага ліку 67 калгасаў.

Такім чынам, увядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах праходзіць нездавальняюча.

Па тых калгасах, дзе шырока абг

Ператворым БССР--у тарфяны Данбас

Вялізарныя рэсурсы торфу ў Савецкай Беларусі павінны стаць асноўнай базай для разгортваньня электрыфікацыі, забесьпячэньня апалам прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і матар'ялам для хімічнай пераапрацоўкі

Аб рабоце тарфяной прамысловасьці і падрыхтоўкі да сэзону 1931 г.

Пастанова ЦК КП(б)Б

I

1. Узрастаючыя патрэбнасьці прамысловасьці культурна-бытавых устаноў у паліве, неабходнасьць ращучага спыненьня скарыстаньня лесу для апалу, высоўваюць перад Савецкай Беларусьсю задачу рашучага зьмяненьня ня энэргетычнай і апальнай базы шляхам поўнай замены ў першую чаргу—у прамысловасьці вугля і дроў—торфам, а таксама максымальнага скарыстаньня торфу для будаўнічай прамысловасьці, сельскае гаспадаркі і хэмічнай пераапрацоўкі. Вялізарныя рэсурсы торфа ў Савецкай Беларусі павінны стаць асноўнай базай для разгортваньня электрафікацыі, снабжэньня паліваам прамысловасьці, культурна-бытавых устаноў і для прамысловай пераапрацоўкі.

2. ЦК адзначае няўпэнасьць ў радах партыйнай арганізацыі агульнай недаацэнкі народна-гаспадарчага значэньня торфа для забесьпячэньня індустрыялізацыі БССР; да гэтага часу яшчэ ня здолелі забясьпечыць бальшавіцкае разгортваньне рашаючага для Беларусі віда топліва і прамысловай сыраэвны—торфа. Фонды торфа БССР, структура торфа у розных раёнах—ня вывучаны, няма таксама неабходнай увязкі паміж геаграфічным разьмяшчэньнем прамысловасьці і тарфянымі заводамі.

Тэмпы разьвіцьця здабычы і пераапрацоўкі торфу адстаюць ад патрэбнасьці ў торфе і яго прадукту. Шкодніцтва ў тарфяной прамысловасьці было накіравана ў першую чаргу на згортваньне разьведвацельных работ, замаруджаньне тэмпаў росту здабычы торфа, мэханізацыі здабычы і транспартоўкі торфа; шкоднікі таксама садзейнічалі выбару найбольш адлеглых ад прадпрыемстваў вучасткаў для распрацоўкі торфу, пры наяўнасьці больш блізкіх да прадпрыемстваў вучасткаў.

3. Ў выніку гэтага мы маем нізкі тэмп роста па забясьпячэньні патрэб сацыялістычнай прамысловасьці тарфяным апалам (удзельная вага торфу ў апальным балянсе прамысловасьці складала ў 1930 г. 16,4 проц., а ў 1931 г.—18,9 проц.). У 1931 г. замест патрэбных 1067 тыс. тон, намечана здабыць усяго 658 тыс. тон, ці 59%. Да гэтага часу адсутнічае мэханізацыя падрыхтоўчых работ. Мэханізацыя здабычы і транспартоўкі торфу стаіць на вельмі нізкім узроўні. Пераапрацоўка торфу ў ізоляцыйныя пліты на падсьпілку ў брыкет, амаль не разгорнута. Хэмічная пераапрацоўка яшчэ зусім не разгорнута. Таксама адсутнічае план па пераводу прамысловых прадпрыемстваў на тарфяны апал і прыстасаваньне топак для тарфянога апалу. Слаба разгорнута работа па забесьпячэньні тарфяной прамысловасьці рабочай сілай і кваліфікаванымі спэцыялістымі.

4. Выкананьне за 1930 год толькі 69,4 проц. прамфінпляну, падвышэньне сабекошту на 21 проц. замест вызначэньня на 10 проц. сьведчыць аб незадавальняючай рабоце тарфяной прамысловасьці за 1930 г. У галіне падрыхтоўкі да выкананьня пляну торфздабычы на 1931 г. таксама маюцца буйнейшыя недахопы, як-то, да гэтага часу план на 1931 г. не забясьпечан рабочай сілай, не падрыхтаваны мэханізмы, слаба выконваецца план будаўніцтва, асабліва неблясьпечна абстаіць справа з вывазам торфу. Усе гэтыя недахопы ставяць пад пагрозу выкананьне пляну 1931 г. Слабая падрыхтоўка да выкананьня пляну 1931 г. зьяўляецца вынікам недастатковай работы кіраўніцтва тарфяной прамысловасьці па разгортваньні сапраўдна бальшавіцкіх тэмпаў работы.

Побач з недахопамі ў рабоце Белторфаб'яднаньня і заводаў нагляцаецца недаацэнка задачы і работы тарфяной прамысловасьці з боку гарадзкіх і раённых партыйных і савецкіх арганізацый, (Сьмілавіцкай, Лепельскай, Барысаўскай, Дубровенскай, Расьнянскай і г. д.). Гэтая недаацэнка выражаецца перш за ўсё ў слабым удзеле і дапамозе правядзеньню падрыхтоўчых і будаўнічых работ на торфзаводах, фактычным ігнараваньні ў энергу раённай задачы па забясьпячэньні торфазаводаў рабочай сілай, гужавым транспартам для вывазкі торфу і слабай пастаноўкай партыйна-масавай і культурна-выхаваўчай работы сярод рабочых мас, чым у прыватнасьці, трэба тлумачыць тое, што на торфазаводах маецца найменшая партыйная праслойка, чым ва ўсіх галінах прамысловасьці Беларусі.

II

5. ЦК КП(б)Б ставіць перад тарфяной прамысловасьцю наступныя асноўныя задачы: забясьпечыць на працягу трох год такое разгортваньне здабычы торфу, якое забясьпечыла-бы, як мінімум перавод у гэты тэрмін усёй прамысловасьці выпрацоўкі электраэнэргіі і асноўных культурна-бытавых устаноў прамысловых цэнтраў на тарфяны апал. План павінен прадугледзіць таксама забясьпячэньне торфу для торфапераапрацоўваючых заводаў. Важнейшымі ўмовамі забясьпячэньня такога тэмпу росту тарфяной прамысловасьці зьяўляецца:

а) поўная мэханізацыя падрыхтоўчых работ і работ па здабычы і транспартоўцы торфу;

б) пераход да сталага складу рабочых у тарфяной прамысловасьці з тым, каб на працягу бліжэйшых трох год у тарфяной прамысловасьці працавала-б круглы год ня менш 75 проц. сталых рабочых;

в) фарсіраванае разгортваньне навукова-дасьледчых работ з такім разьлікам, каб на працягу трох год забясьпечыць вывучэньне ў асноўным колькасьці фондаў торфу ў БССР і іх структуры, а таксама распрацоўку пытаньняў мэханічнай, тэрмічнай і хэмічнай апрацоўкі торфу;

г) падрыхтоўка і правядзеньне будаўніцтва заводаў па мэханічнай, тэрмічнай (пліты, падсьпілка, брыкет) і хэмічнай пераапрацоўкі торфу;

д) забесьпячэньне падрыхтоўкі кадраў рабочых, адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу і спэцыялістых вышэйшай кваліфікацыі.

Даручыць Дзяржпляну тэрмінова прыступіць да складаньня генэральнага пляну разгортваньня тарфяной прамысловасьці. Кантрольныя лічбы па тарфяной прамысловасьці на 1932 год прадставіць не пазьней, як 15 мая.

III

6. Для забясьпячэньня выкананьня колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну на 1931 г., ЦК прапануе:

а) Белторфаб'яднаньню, дырэктарам заводаў, усім Гаркомам і Райкомам, дзе маюцца торфазаводы (Менск, Гомель, Віцебск, Ворша, Магілеў, Барысаў, Смалявічы і г. д.), усім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям торфазаводаў паставіць у цэнтры ўвагі ўсяе работы задачу карэннага пералому ў справе падрыхтоўкі да сэзону вырабу торфу ў 1931 годзе.

Белторфаб'яднаньню безадкладна пе рабудаваць сваю работу і работу заводаў па ліквідацыі прарываў, да сэзону 1931 г. а тым, каб усе неабходныя мерапрыемствы, як-то: падрыхтоўка балот, скаваньне буддаўніцтва, мантаж машын, вывяз торфу і інш.—поўнасьцю былі-бы скончаны ў вызначаны тэрмін;

б) Белторфаб'яднаньню, кіраўніцтву заводамі забясьпечыць правільную арганізацыю вытворчых працэсаў, устанаўленьне сапраўдных норм, рацыянальнае скарыстаньне абставаньня і рабочай сілы, разгарнуць энэргічную барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы шляхам палепшаньня жыльлёва-бытавых умоў, самаканстрактацыі і мобілізацыі ўсіх рабочых вакол задач тарфяной прамысловасьці. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на выкананьне дырэктыў партыі аб эдзінаначальні і бязумоўнае правядзеньне прынцыпу гасп. разліку ня толькі ў трэсьце, але на кожным заводзе;

Белторфаб'яднаньню прыняць усе захады да мэханізацыі вывазкі торфу, шляхам арганізацыі пад'язных шляхоў, вузкакалеек, а таксама пабудовы дарог для вывазкі торфу аўтатрактарным транспартам. Лічыць неабходным тэрмінова рашуча палепшыць становішча на ветцы Белдрэс—Тарфяны завод.

Рашуча спыніць разбазарваньне тарфяных масываў, абавязаўшы Белторфаб'яднаньне і торфзаводы і забясьпечыць поўнае і рацыянальнае скарыстаньне распрацоўваемых балот;

в) прыняць прапанову саюзу тарфяных рабочых аб тым, каб прамфінплян 1931 г., г. зн. здабычу 658 тыс. тон торфу выканаць замест 11.163 рабочых толькі 10 тыс. рабочых, шляхам ушчыльненьня рабочага дню, падвышэньня вытворчасьці працы і зьмацненьня працоўнай дысцыпліны. Абавязаць камсамол накіраваць у тарфяную прамысловасьць не пазьней як да 1 мая—1000 камсамольцаў. Наркампрацы, сумесна з Белторфаб'яднаньнем і Райвыканкомамі да 25 красавіка забясьпечыць торфзаводы поўнасьцю рабочай сілай;

г) саюзу рабочых тарфяной і сланцавай прамысловасьці, сумесна з Белторфаб'яднаньнем забясьпечыць разгортваньне ў тарфяной прамысловасьці камуністычных мэтадаў працы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыю сярэдніх брыгад і прамадзкіх буксіраў, абавязаць Белторфаб'яднаньне, кіраўніцтва заводаў, давесьці прамфінплян да кожнай брыгады і кожнага рабочага не пазьней як да 1-га мая;

д) прапанаваць НКСнабу і Белкаапсаюзу своячасова і бесьперабойна забясьпечваць торфарабочых прадуктамі і прамтаварамі па ўстаноўленых НКСнабам СССР нормах. Белкаапсаюзу, Райспажыўтаварыствам, арганізаваць грамадзкае харчаваньне на ўсіх торфаразработках, забясьпечыўшы ўсіх рабочых грамадзкім харчаваньнем. Белторфаб'яднаньню прадставіць для каапэрацыі памяшканьні для сталовак. Каапэрацыя павінна арганізаваць дастаўку тэрмасамі абедаў на месцы работ. Каапэрацыі таксама забясьпечыць торфразработкі ларкамі. Белкаапсаюзу арганізаваць сыстэматычны кантроль за выкананьнем Райспажыўтаварыствамі задач па забесьпячэньні рабочых торфразработак.

е) ВСНГ БССР паставіць пытаньне перад ВСНГ СССР аб адчыненьні тарфянога інстытуту і тэхнікуму пры ім у БССР для падрыхтоўкі кадраў для тарфяной прамысловасьці Беларусі.

IV

У галіне партыйна масавай работы важнейшымі задачамі зьяўляюцца: а) мобілізацыя ўсіх рабочых торфазаводаў вакол пытаньняў выкананьня прамфінпляну, барацьбы з кулацкімі, рвацкімі і адсталымі настроямі пасобных груп рабочых;

б) разгортваньне работы па замацаваньні сэзонных рабочых на сталай рабоце ў тарфяной прамысловасьці. Выхаванье актыву тарфяных рабочых і вылучэньне яго на кіраўчую работу і падрыхтоўкі яго для вучобы па лініі тарфяной прамысловасьці;

в) асаблівую ўвагу партарганізацыі павінны зьвярнуць на сыстэматычнае ўцягненьне ўсіх рабочых, тэхнічнага пэрсаналу ў сацспаборніцтва і ўдарныя брыгады, разгарнуўшы пырокую агітацыйна - прапагандыцкую работу па растлумачэньні значэньня камуністычных мэтадаў працы, усёй палітыкі партыі, асабліва задач у галіне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай падставе кулацтва, як класы;

г) абавязаць Райкомы і завадзкія партыйныя арганізацыі забясьпечыць абслугоўваньне пасобных груп рабочых, у першую чаргу неабходна забясьпечыць сыстэматычны агон партыйным уплывам партыйна-масавых, прафэсыянальнай і культурна-выхаваўчай работай работніц-тарфяніц. Арганізаваць на кожным торфзаводзе бібліятэку, радыёфікаваць і кінофікаваць усе заводы;

д) усім Райкомам КП(б)Б узмацніць партыйнае кіраўніцтва работай торфзаводаў і аказаць ім неабходную дапамогу ў іх рабоце; у красавіку месяцы ўсім Райкомам правесьці масавую праверку падрыхтоўкі заводаў да сэзону;

е) важнейшай задачай як Райкомаў, так і партарганізацый на торфзаводах зьяўляецца выкрыцьцё кулацкіх і клясава-варожых элементаў на торфзаводах і ачыстка ад гэтых элементаў апарату торфазаводаў і рабочых брыгад.

Партарганізацыі таксама павінны забясьпечыць сыстэматычнае выкрыцьцё ўсялякіх апартуністычных скажэньняў лініі партыі на торфазаводах, бязьлітасна ачышчаючы арганізацыі ад усіх тых, хто зрывае выкананьне заданьняў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

ж) у мэтах узмацненьня партыйна-масавай работы на працягу красавіка м-ца паслаць на торфзаводы ня менш 10 сталых партработнікаў. Аддзелу Кадраў і Наркампрацы узмацніць апарат Белторфаб'яднаньня і заводаў. Даручыць Арг. Аддзелу паслаць на 3 месяцы пяць Арг. Проп. груп на торфзаводы. Прыняць да ведама заяву т. Рыжова, што да 1 мая ЦСПСБ пашле 10 сталых адказных профработнікаў у саюз тарфяных рабочых. Спыніць частую перабоску работнікаў торфазаводаў у час сэзону. Аддзелу Кадраў сумесна з ВСНГ накіраваць 15 гаспадарнікаў з прамысловасьці для ўзмацненьня апарату торфазаводаў і Белторфаб'яднаньня.

1ы РЭЙД ударных брыгад „Савецкай Беларусі" па Жлобінскаму вузлу

Пабач з дасягненьнямі ў галіне ліквідацыі абязьлічкі першы рэйд выявіў, што трыкутнік службы руху ня ведае колькі рабочых ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Якасьць рамонту дрэнная. Паравозы па 5 з паловай месяцаў стаяць у рамонце. Па нядбайнасьці машыністаў псуюцца вагоны. Дрэнна з падрыхтоўкай кадраў. Гэта адбіваецца на пераводзе вузла на 7 гадзінны рабочы дзень. Не разгорнута работа па аўладаньні тэхнікай.

Усё гэта выявіў першый рэйд ударных брыгад нашай газэты.

Жлобінскія чыгуначнікі, перабудуйце сваю работу на сапраўднае выкананьне загаду партыі і ўраду ў галіне перабудовы работы транспарту.

Палепшыць якасьць рамонту паравозаў

Жлобінскі вузел перайшоў на спарную язду канчаткова ў лютым месяцы. Зараз усе паравозы прымацаваны да паравозных брыгад.

Папярэднія вынікі спаранай язды ка жуць аб тым, што, дзякуючы ажыцьцёленьню гэтага мерапрыемства, ста новішча паравозаў значна палепшылася. Панізіўся процант папсаваньня паравозаў ад 45,35 да 32. Адносна рамонту паравозаў трэба сказаць, што тут яшчэ ня ўсё добра. Ёсьць шмат выпадкаў паўторнага рамонту паравозаў, што сьведчыць не аб зусім добрай якасьці рамонту. Кепска абстаіць справа і з тэрмінамі рамонту паравозаў. Напрыклад, трэба адрамантаваць пара воз на працягу пяцідзённага тэрміну, а ён рамантуецца 10 дзён.

Усе гэтыя недахопы маюцца таму, што справа з працоўнай дысцыплінай абстаіць ня зусім добра. Назіраюцца выпадкі прагулаў з боку рабочых. Ад міністрацыі, прафсаюз. да прагульшчыкаў ня ўжываюць рашучых мер.

Справа з адзінаначальнем на вытвор часьці абстаіць таксама ня зусім добра. Не адчуваецца належнай адказнасьці за даручаную работу, не наладжана праверка выкананьня. Дрэнна вытвараецца праверка вытваранага рамонту паравозаў.

Як-жа абстаіць справа з сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам?

У час правядзеньня месячніка штурму былі пераключаны дагаворы паміж асобнымі брыгадамі. Зараз разгорнуты набор новых ударнікаў. Праверка выкананьня дагавораў пастаўлена дрэнна. Ня зусім добра абстаіць справа і з вучотам ударніцтва.

Ва ўсёй правадзімай рабоце маецца ня ўвязка ў дзейнасьці партячэйкі, мясцкому і адміністрацыі. Партячэйка і цэхкамітэт не перабудавалі сваю работу тварам да вытворчасьці.

Да пераходу на сямігадзінны рабочы дзень дэпо ст. Жлобін не падрыхтавалася. Аб гэтым кажуць такія факты, як невыкананьне, наяўнасьць досыць вялікага процанту хворых паравозаў і г. д. Толькі за апошні час можна заўважыць некаторы зрух у падрыхтоўцы да пераходу на 7-гадзінны рабочы дзень. Пачата адпаведная работа для ўзьнаўленьня прадукцыйнасьці працы. Разгорнуты збор рабочых прапаноў, прымаюцца рашучыя меры да поўнай ліквідацыі прагулаў.

У галіне арганізацыі паходу за тэхніку нічога ня зроблена. Аб арганізацыі пуркторку па тэхнічных ведах ніхто і думаць ня хоча. А для паходу за тэхніку ёсьць усе ўмовы, якія дазваляюць гэту справу разгарнуць ва ўсю шырыню.

Трэба лічыць абуравочым зьявішчам такое становішча, калі рухавік, які абслугоўвае патрэбы дэпо, знаходзіўся ў рамонце 5 з паловаю месяцаў. Больш таго, пасьля капітальнага рамонту рухавік зноў не працуе. Зараз рухавік зноў рамантуецца і калі ён зможа быць пушчаным у ход—невядома. Вінаватыя ў зрыве рамонту рухавіка ня прыцягнуты да адказнасьці.

Усе гэтыя недахопы па службе цягі зараз-жа павінны быць ліквідаваны... Трыкутнік павінен у першую чаргу пераключыць сваю работу на апэрацыйнасьць і мабілізаваць рабочыя масы на канчатковую ліквідацыю прарываў, якія яшчэ маюць месца на чыгунцы.

Барацьбой за здаровы паравоз мацней ударым па ніцках, хныканьнях, па кулаку і яго агентуры, якія імкнуцца затрымаць бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Ударная брыгада газэты «Сав. Беларусь» **Кучынская, Масюцік, Ніпакайчыцкі, Дзеньнаў.**

Марудна рыхтуюцца кадры

Кіраўніцтва раёну мала цікавіцца гэтай справай

Праблема кадраў для чыгункі-балючае пытаньне. Ударныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад чыгункі карэннай перабудовы сваёй работы. Чыгунка ў сучасны момант ня можа адставаць ад тэмпаў ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва. На транспарт ускладзены зараз вялізарныя задачы. Адзэй з неабходнейшых умоў у пасьпяховым выкананьні задач ускладзеных на транспарт, у прыватнасьці на чыгунку, зьяўляецца ўдарная і баявая работа па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, у якіх адчуваецца вялізарнейшая патрэба.

Пытаньне аб кадрах паўстае ва ўсю шырыню зараз яшчэ і таму, што Жлобінскі чыгуначны вузел рыхтуецца да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Кіраўніцтва раёну, пры ўдзеле прадстаўнікоў саюзу склала падрабязны плян падрыхтоўчай работы па пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Але-ж на вялікі жаль, пляны падрыхтоўчай работы па пераходу ў пераважнай большасьці месц (у нізавых зьвеньнях) не прапрацаваны. Як адміністрацыя, а таксама і саюзныя арганізацыі не адвялі гэтай справе належнай увагі і ёсьць пэўная пагроза, што пераход на 7-мі гадзінны рабочы дзень ня будзе як след падрыхтаваны.

Адсутнасьць належнай падрыхтоўкі да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень дае сябе асабліва адчуваць у дэпо станцыі Жлобін. Плянамі, якія прапрацаваны адміністрацыяй і саюзам, прадугледжваюцца значныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць палепшаньне працы, эканомію часу і сродкаў. Але-ж плян застаецца плянам. Уся справа ў тым, што практычна нічога ня робіцца па яго выкананьні. Не адпушчаюцца сродкі на дадатковае абсталяваньне прадпрыемтваў і пасобных цэхаў. Амаль што нічога ня робіцца па ўкамплектаваньні кваліфікаванымі кадрамі, якіх не хапае як на лініі, так і на вузьле ў колькасьці 52 чалавек. Вось гэтыя няўвязкі ў падрыхтоўчай рабоце да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень адмоўна адбіваецца на якасьці прадукцыі своячасовасьці ў выкананьні пасобных вытворчых заданьняў.

Такая блытаніна ў падрыхтоўчай рабоце да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень уносіць блытаніну і ў справу скарыстаньня маючыхся ў наяўнасьці кадраў. Нерацыянальна разьмяркоўваецца кваліфікавая рабочая сіла. Так, у дэпо Жлобін, замест 7 рабочых ставіцца ў адну брыгаду па 5—6 чалавек. Нормы выпрацоўкі, у сувязі з увядзеньнем новай аплаты работы, яшчэ ня выпрацаваны. Графікі 7-мі гадзіннага рабочага дню яшчэ не разасланы мясцом, для далажаньня іх да мясцовых умоў.

Калі няма пэўнай чоткасьці ў справе скарыстаньня маючыхся ў наяўнасьці кадраў, то як-жа справа абстаіць з падрыхтоўкай новых кадраў?

У справе падрыхтоўкі новых кадраў разгорнута адпаведная работа. Зараз існуюць і працуюць 11 розных курсаў, якімі ахоплена 383 чал. Да справы падрыхтоўкі масавых кадраў прыцягнуты лепшыя інжынэрна-тэхнічныя сілы. Мэтад і сыстэма выкладаньня на курсах пераважна лекцыйны, што бязумоўна не задавальняе курсантаў.

Значна лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай кадраў па лініі ФЗВ. Школа ФЗВ добра падрыхтавалася да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень. У сувязі з пераходам на 7-мі гадзінны рабочы дзень, прадугледжваецца яшчэ лепшае забесьпячэньне вучнуў матар'ялам для работы, таксама інструктарскім складам. Пераход на 7-мі гадзінны рабочы дзень ФЗВ сустракае з наступнымі якаснымі паказьнікамі: поўным выкананьнем навучальных праграм, дастатковай пасьпяховасьцю вучняў, поўнай ліквідацыяй другагодніцтва. Такіх паказьнікаў школа дамаглася, толькі таму, што ўся работа праводзілася і праводзіцца зараз мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. ФЗВ у сучасны момант зьяўляецца ўдарнай.

Галоўным недахопам зьяўляецца адсутнасьць належнай цьвёрдай плянавасьці ў падрыхтоўцы кадраў. Няма пэўнага падліку, колькі такіх-то і такіх-то кадраў трэба падрыхтаваць у такі-то тэрмін. Нізаны друк пытаньнем барацьбы за кадры ўсім не займаецца. Часу да поўнага пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень застаецца мала. Трэба зараз-жа пакончыць са стаўкай на самацёк у справе падрыхтоўкі да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Трэба таксама пакончыць са стаўкай на самацёк у падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, якія патрэбна значна пашырыць у сувязі з пераходам на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Барацьбу за кадры трэба паставіць у асяродак увагі рабочай грамадзкасьці і дамагацца найбольш пасьпяховага выкананьня гэтай баявой задачы.

Ударная брыгада газэты «Сав. Бел.» **Купрашэвіч, Міхайлоўскі, Будзілоўская, Аскерка, Гальмукова.**

Трохкутнік ня кіруе сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам

«Служба руху на Жлобінскім чыгуначным вузьле аб'ядноае 557 чалавек, з якіх пераважная частка рабочыя. Дагавор па сацспаборніцтву заключаны з Віцебскім чыгуначным вузлом. Сацспаборніцтва ідзе на лепшую спэцыялізацыю цягнікоў. Апроч гэтага кожная зьмена спаборнічае з ваколічнымі калгасамі. Рампагрузчыкі спаборнічаюць з Карасьцелем на лепшую загрузку ваг, зьніжэньне сабекошту нагрузкі і перагрузкі вагонаў.

Кепска пастаўлена справа з вучотам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ні партячэйка, ні МК, ні адміністрацыя на сёньняшні дзень ня ведаюць, якая колькасьць рабочых прымае ўдзел у сацспаборніцтве. Заключылі дагаворы на сацспаборніцтва і на гэтым паставілі кропку. Па рамцы сацспаборніцтва вялося з Карасьцелем да сакавіка месяца, а ў сакавіку скончыўся тэрмін дагавору і разам з гэтым скончылася і сацспаборніцтва. Зводкі аб ходзе сацспаборніцтва пасылаліся поштай, а ці адпавядалі яны сапраўднасьці, дык гэтым ніхто не цікавіўся.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва зараз знаходзяцца ў дрэнным становішчы. Трэба ўжо прыступаць да праверкі выкананьня і перазаключэньня дагавораў, а падрыхтоўка да гэтага не разгорнута. Аб падрыхтоўцы да другой гадавіны сацспаборніцтва ніхто і думаць ня хоча.

Цяпер паглядзім як-жа працуе служба руху?

Перш за ўсё аб выкананьні ўстаноўленых каэфіцыэнтаў і вымерыкаў. Для манэўровай працы каэфіцыэнт устаноўлены ў 17,2, а выкананы па становішчы на 1-IV—31 г. толькі 14,6%—па прастоі вагонаў таварнага парку па I аддзеле каэфіцыэнт устаноўлены ў 6,0, а выкананы па становішчы на 1-IV—31 г. на 9,4. Такое-ж становішча наглядаецца з прастоямі вагонаў таварнага парку, і па 2 аддзеле. Па прастоі цыстэрн каэфіцыэнт устаноўлены ў 4,0, а выкананы за сьнежань 5,4, за люты—3,7 і сакавік 3,8. Невыкананы каэфіцыэнт па манэўровай працы і прастоі вагонаў.

Становішча з своячасовай адпраўкай цягнікоў пагражаючае. Зьвернемся да лічбаў. Так было спазьненьняў цягнікоў у сьнежні месяцы г. г. 56,0, у лютым—62, у сакавіку—82,8. Гэтыя лічбы паказваюць на тое, што крывая лінія па графіку ідзе ня ўніз, а ўверх. Чаму спазьненьні ў сакавіку месяцы павысіліся да 82,8 проц.? А таму, што адміністрацыя ў гэтай справе праяўляе паўнейшую нягібкасьць і непаваротлівасьць. Па чыёй віне несвоячасова адпраўлены цягнікі: па вине дзяжурнага па станцыі заг. манэўрамі і складніка брыгад—37 выпадкаў, па віне ДТО, якое несвоячасова падало паравозы, 45 выпадкаў.

Пытаньне аб падрыхтоўцы да веснавых пасеўных паравозак ставіцца на сходах рабочых, нарадах адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Былі выпадкі калі брыгада саздейнічала паравозу пасеўных грузаў. Але гэтыя брыгады не працуюць. Паводле вынікаў учотку праходу грузаў праз станцыю, відаць што і ў гэтай справе ёсьць вялізарнейшы прарыў. Ёсьць шмат выпадкаў, што грузы затрымліваюцца па 2 дні. Прывядзем адзін толькі характарны прыклад. Груз прыбыў 6-IV, а 14 гадзіне, а адпраўлены 8-IV—а 5 гадзіне 25 хв. Як-жа праходзяць праз вузел пасеўныя грузы? Гэтым пытаньнем ніхто не цікавіцца.

Становішча з працоўнай дысцыплінай па вузьле прымушае чакаць шмат лепшага, ёсьць выпадкі адмаўленьня ад работы, няўдкі на работу без уважлівых прычын. Больш таго, ёсьць выпадкі п'янства і зьяўленьня на работу ў нецьвярозым выглядзе, што ва ўмовах работы чыгункі зьяўляецца небясьпечным зьявішчам.

Насьценная газэта службы руху абрасла павуцінай. Насьценная не зьяўляецца сродкам барацьбы за выкананьне транфінпляну на вузьле. Работай насьценгазэты ня цікавіцца ні адміністрацыя, ні мясцком, ні партячэйка. Рабкоры не згрупаваны вакол насьценгазэты.

Трыкутнік службы руху не павярнуўся тварам да ўдарных задач на вытворчасьці. Работа трыкутніку ідзе на хвалях самацёку, якая ўжо пачала перарастаць у прававантартуністычную практыку. Трэба зараз-жа перабудаваць работу і па сапраўднаму ўзяцца за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) і ЕНК СССР аб чыгуначным транспарту.

Ударная брыгада ваг. «Сав. Бел.» **Крук, Лазараў, Мачулайціс.**

Падрыхтоўка да капітальнага будаўніцтва—на бальшавіцкія рэйкі

Дзякуючы правільнаму ленінскаму кіраўніцтву камуністычнай партыі, капітальнае будаўніцтва разам з ростам нашай народнай гаспадаркі шырака расьце і разгортваецца.

Капітальнае будаўніцтва 1931 г. па лініі рэспубліканскай прамысловасьці БССР выдзелена ў суме 43,5 млн. р. Выдаткі па капітальным будаўніцтве ўключаюць у сябе і сродкі на забесьпячэньні, намечаных да пабудовы і існуючых фабрык і заводаў, неабходным абсталяваньнем. На гэту мэту вызначана 8 млн. руб. А калі ўлічыць і кошт мантажу абсталяваньня, дык выдаткі па абсталяваньні складаюць суму ў 13,5 млн. руб. (30 проц. да агульнага кошту капітальнага будаўніцтва).

Галоўныя сумы выдаткаў па капітальным будаўніцтве 1931 г. накіраваны на разьвіцьцё такіх галін нашай прамысловасьці, як торф, мэханізацыя будаўніцтва, будматар'ялы, шкло і хэмія ў адпаведнасьці з іх значэньнем у нашай народнай гаспадарцы. Гэтыя галіны прамысловасьці сумесна складаюць лічбы ў 29 млн. руб., г. зн. каля 70 проц. ад агульнага кошту будаўніцтва.

Гэтыя выдаткі павінны забясьпечыць нашу прамысловасьць торфаапаламі, сельска-гаспадарчы сэктар—машынамі для буйнай гаспадаркі і штучным угнаеньнем, будаўніцтва—неабходнымі матар'яламі.

Таксама па сац. культур. бытавым будаўніцтве, (куды ўваходзяць сталоўкі, ясьлі, клюбы) будзе выдаткавана сума 1,2 млн. руб.

Будматар'ялаў не хапае

Становішча з забесьпячэньнем будаўніцтва матар'яламі зусім дрэннае. З матар'ялаў Белснабу відаць, што з колькасьці асноўных будматар'ялаў, якія павінны былі быць атрыманы ў 1 кв., для работ тэтага кварталу і для забесьпячэньня патрэб разгортваньня будаўніцтва ў другім квартале, да канца лютага месяцу была вялікая недагрузка будматар'ялаў.

У сакавіку становішча не палепшылася. Гэта значыць, што разгортваньне будаўнічых работ, якое павінна пачацца прыкладна ў сярэдзіне красавіка м-ца, стаіць пад пагрозай зрыву.

Ня лепш становішча з забесьпячэньнем будаўніцтва 1931 г. матар'ялямі: з агульнай патрэбнасьці ў піленым лесе ў 72 тыс. кубаметраў, мы атрымаем толькі 40 тысяч к. м. (55 проц.); цэмантам мы будзем задаволены ў разьмеры 54 проц. (з 92 тыс. бочак—50 т. бочак); цьвікамі—на 40 проц., дахавым жалезам—на 28 проц., гатункавым жалезам—22 проц., трубамі жалезнымі ў разьмеры 25 проц.

Зусім дрэннае становішча з бэлькамі і чуг. трубамі. Бэлек нам вызначана толькі 20 проц. ад усёй патрэбнасьці, з труб чугунных—10 проц.

Нехапаючую колькасьць дахавага жалеза магчыма было замяніць рубэройдам. Але таксама і гэтага матар'ялу для ўсёй БССР вызначана нехапаючая колькасьць—з усёй патрэбнасьці толькі 30 проц.

Будматар'ялы павінны быць

З прычыны дрэннай работы чыгуначнага транспарту засталіся невыкананымі тыя нарады на будматар'ялы, якія павінны былі забесьпечыць будаўніцтва 1 кварталу і разгортваньне будаўніцтва ў 2-м квартале. Таму справа з забесьпячэньнем будаўніцтва матар'ялямі па лініі транспарту будзе натружаная. У гэтым напрамку неабходна прыняць тэрміновыя і рашучыя захады.

У гужавым транспарце таксама будзе адчувацца недахват. Трэба працьвіхнуць Будаб'яднаньню задавальняцца ў разьмеры 60 проц. Трэба рацыянальна выкарыстаць транспарт.

Даць рабсілу

Забесьпячэньне будаўніцтва бягучага году рабсілай знаходзіцца не на належнай вышыні. Ня гледзячы на тое, што будаўнічая арганізацыя Будаб'яднаньне прадставіла ўжо НКПрацы свае заяўкі на патрэбную рабсілу, з боку НКП не наглядаецца неабходнай гібкасьці ў напрамку вызначэньня пунктаў па вярбоўцы рабсілы. Задавальненьне маючайся патрэбнасьці ў рабочай сіле праз нашыя ўласныя крыніцы можна быць задаволена ня ў поўнай меры.

Буйнейшая наша бударганізацыя «Будаб'яднаньне» зможа атрымаць толькі 12 чысьч чалавек рабочых, тады, калі патрэбнасьць у рабсіле на чэрвень - жнівень вызначаецца паводле плану аб'яднаньня ў 17 тыс. чал. Гэта значыць, што ў самы разгар будаўніцтва Будаб'яднаньню ня будзе хапаць каля 30 проц. рабочай сілы.

Як і ў адносінах матар'ялаў становішча з рабочай сілай у некаторыя моманты будаўнічага сэзону можа выклікаць пагрозу перабояў у работах.

Зусім дрэнна становішча з праектамі па будаўніцтву Мэталяаб'яднаньня, па якім амаль усе аб'екты будаўніцтва бягучага году ня маюць праектаў.

Мэханізаваць работу

Мэханізацыя будаўніцтва летась была далёка ня поўнай. Сёлета мэркуецца павялічыць мэханізацыю работ шляхам павялічэньня колькасьці мэханізмаў, якія будуць працаваць на пабудовах. На мэханізацыю будаўніцтва бягучага году Белдзяржбуду адпушчана 400 тыс. руб.

Становішча з мэханізацыяй цагельных заводаў, якія павінны забясьпечваць будаўніцтва асноўным будматар'ялам дрэннае. У той час, калі ўжо маюцца агрэгаты (мэханізмы) па вырабе цэглы, няма правадоў для падачы току на заводы.

Змагацца за зьніжэньне сабекошту

Самае балючае месца ў нашым капітальным будаўніцтве—гэта пытаньне аб зьніжэньні сабекошту будаўнічых работ. У гэтым напрамку няма яшчэ дасканалага прапрацаванага мэтаду па выяўленьні сапраўднага процанту зьніжэньня сабекошту.

Каб дабіцца сапраўднага зьніжэньня сабекошту, патрэбна прапанаваць аб'яднаньням (асабліва Будаб'яднаньню), каб кошт будаўніцтва быў бы зьніжаны па лініі лепшай арганізацыі работ, галоўным чынам праз узмацненьне мэханізацыі работ і рацыяналізатарскія мерапрыемствы, таксама ўжываньнем пелегчаных канструкцый і новых будматар'ялаў.

Разгаруць работу на аснове ўдарніцтва

Пытаньне рэарганізацыі капітальнага будаўніцтва ўсё яшчэ ня зрушана з мёртвага пункту. Увядзеньне ў практыку будаўніцтва новых будматар'ялаў і палегчаньне канструкцый ўсё яшчэ сустракае в

Законы і пастановы ураду БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. арт. 5—9, 29 і 115 Кодэксу аб працы БССР.

У адпаведнасьці з арт. 16 пастановы ЦВК і СНК СССР «Пра парадак найманьня і пра разьмеркаваньне рабочай сілы і змаганьне з цякучасьцю рабочай сілы («Известия ЦИК СССР и ВЦИК» за 17-XII м. г.), ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць зрабіць у Кодэксе аб працы БССР наступныя зьмены:

I. Запісаць артыкулы 5—9 у наступнай рэдакцыі:

«5. Усе прадпрыемствы, установы, гаспадаркі і асобы павінны наймаць рабочых і служачых толькі праз органы працы, апроч выняткаў, паказаных у артыкулах 6 і 7.

6. Асобы, якія скончылі вышэйшыя школы і тэхнікумы, наймаюцца на падставе спэцыяльных законаў аб разьмеркаваньні іх на работу.

7. Не праз органы працы дазваляецца наймаць:

а) адказных адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў і спэцыялістаў;

б) працаўнікоў, якія пераходзяць з аднаго прадпрыемства, установы, альбо гаспадаркі ў другое са згоды адміністрацыі таго прадпрыемства, установы альбо гаспадаркі, у якой яны працуюць;

в) вучняў саматужнікам і рамесьнікам, якія працуюць адны альбо пры дапамозе ня больш двох наймовых рабочых;

г) батракоў і батрачак аднаасобным працоўным сялянскім гаспадаркам і па стухоў сялянскім гаспадаркам;

д) хатніх работніц;

е) іншых працаўнікоў, на падставе спэцыяльных згод з органамі працы.

8. Пералікі пасад, на якія ў адпаведнасьці з п. «а» артыкулу 7 наймальніку дазваляецца наймаць працаўнікоў беспасрэдна, а таксама парадак заключэньня згод, прадугледжаных п. «а» арт. 7, устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

9. Кваліфікаваныя рабочыя і спэцыялісты, выяўленыя ў прадпрыемствах агрэгаваннага сэктару, як скарыстаныя не па спэцыяльнасьці, перарозьмяркоўваюцца органамі працы ў парадку, які вызначаецца спэцыяльнаю пастановаю».

II. Запісаць арт. 29 у наступнай рэдакцыі:

«29. Працоўныя дагаворы робяцца: а) на пэўны тэрмін, але ня больш 3-х гадоў, б) на нэпэўны тэрмін; в) на час выкананьня якой-небудзь работы».

III. Запісаць арт. 115 у наступнай рэдакцыі:

«115. Асобам, якія працуюць у асабліва шкодных і небясьпечных прадпрыемствах і ў мясцовасьцях з шкодным кліматычнымі ўмовамі, дасцца апроч чарговага, дадатковы водпуск ня менш як на 2 тыдні. Пералік галін працы і прафэсій, якія даюць права на дадатковы водпуск, устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

Рабочым, беспасрэдна занятым на вытворчасьці ў горнай, мэталёвай, хэмічнай і тэкстыльнай галінах прамысловасьці, у прамысловасьці будаўнічых матарыялаў, на чыгуначным, водным і аўтадорным транспарце і на буйных будаўніцтвах, калі яны прапрацавалі ў адным і тым самым прадпрыемстве альбо будаўніцтве бесьперапынку ня менш двох гадоў пасьля 1 лістапада 1930 г., дасцца дадатковы водпуск на 3 дні, або грашовая кампэнсацыя ў разьмеры 3-х дзённага заработку штогод.

Пераход працаўніка ў іншае прадпрыемства па загаду адміністрацыі альбо органу працы не перарывае паказанага 2-х гадовага тэрміну».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

5 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага ВыканаўчагаКамітэту БССР

ПРА НАЗНАЧКНЬНЕ тав. ФЕЛЬДМАНА Я. М. НАМЕСЬНІКАМ НАРОДНАГА КАМІСАРА ФІНАНСАЎ БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе:

Назначыць тав. **Фельдмана,** Язэпа Маркавіча, Намесьнікам Народнага Камісара фінансаў БССР з астаўленьнем яго Кіраўніком Беларускай Канторы Дзяржбанку.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. Гілякевіч.

13 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БСР

пра зьмену арт. арт. 44 і 45 Грамадзянскага Кодэксу БССР, дапаўненьне яго артыкулам 51-а і скасаваньне арт. 438 і ўвагі да арт. 446 гэтага Кодэксу.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Артыкулы 44 і 45 Грамадзянскага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі:

«44. Права на іск спыняецца з прычыны непадаваньня іску на працягу трох гадоў з таго часу, калі права на іск узьнікла, апроч выпадкаў, калі ў законе ўстаноўлен іншы тэрмін даўнасьці.

Па абавязнасьцях, якія павінны выконвацца па патрабаваньні крэдытора, іскавая даўнасьць пачынаецца з часу ўзьнікненьня абавязнасьці.

Да іскаў аб адабраньні дзяржаўнай маемасьці з чужога незаконнага ўладаньня альбо карыстаньня даўнасьць ня ўжываецца.

Па пратэрмінаваных выплатах аліментаў і за пакалечаньне іскі задавольваюцца ў той частцы агульнай сумы, якая павінна была быць выплачана на працягу апошніх трох гадоў да падачы іску.

45. Іскавая даўнасьць па ісках супроць дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, каапэрацыйных, прафэсійных, і іншых грамадзкіх арганізацый абмяжоўваецца гадавым тэрмінам, апроч выпадкаў, для якіх законам устаноўлен спэцыяльны тэрмін іскавой даўнасьці».

II. Дапоўніць Грамадзянскі Кодэкс БССР артыкулам 51-а ў наступнай рэдакцыі:

«51-а. Да праў, устаноўленых кажнай коваю пастановаю суда, ужываецца га давая даўнасьць, апроч праў, прызнаных за ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі агрэгаванага сэктару, да якіх ужываецца трохгадовая даўнасьць.

Устаноўленае ў гэтым артыкуле правіла не датычыцца выпадкаў, калі пастановаю суда ўстаноўлен толькі факт».

III. Скасаваць арт. 438 і ўвагу да арт. 446 Грамадзянскага Кодэксу БССР.

IV. Гэтая пастанова ўводзіцца ў дзеяньне з 1 красавіка 1931 г. Патрабаваньні, якія ўзьніклі за шэсьць месяцаў ці больш раней 1 красавіка 1931 г., павінны быць пададзены ў іскавым парадку не пазьней 1 кастрычніка 1931 г., а тыя, што ўзьніклі пазьней за 1 кастрычніка 1930 г., павінны быць пададзены на працягу аднаго году ад дня ўзьнікненьня права на іск.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

5 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену і дапаўненьня пастановы пра пашырэньне гарадзкой мяжы гор. Менску.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** зрабіць наступную зьмену ў пастанове ЦВК і СНК БССР за 18 студзеня 1931 г. «Пра пашырэньне гарадзкой мяжы гор. Менску» (З. З. БССР, 1931 г.

1. Пункт 3 арт. 1-га запісаць у наступнай рэдакцыі:

«3. **Заслаўскага раёну:**

а) Бароўскага і б) Ратомскага, апроч паселішч: Чырвоная Зорка, Ратамка, Нарушайкі, Ваські-Самусеўшчына, Крыжаў, Ганалес, Валоўшчына, Зеленае, Чырвоны Араты, Чырвоны Батрак, Чырвоная Дуброва—Ратамскага сельсавету, якія заставіць у складзе Заслаўскага раёну».

2. **Дадаць** да пастановы арт. 13 у наступнай рэдакцыі:

«13. Даручыць Заслаўскаму Раённаму выканаўчаму камітэту тэрмінова разьмеркаваць далучаныя да яго паселішчы Ратамскага сельскага савету паміж сельскімі саветамі».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гілякевіч.**

5 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАДАНЬНЕ ГОДНАСЬЦІ ЗАСЛУЖАНАГА АРТЫСТА БССР тав. КРЫЛОВІЧУ

За адданую і каштоўна-мастацкую 10-цігадовую працу ў Першым Дзяржаўным Беларускім Тэатры на карысьць пралетарскай рэвалюцыі надаць тав. Крыловічу годнасьць заслужанага артыста Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР
С. Кандыбовіч.

13 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ *да другой бальшавіцкай*

Шануй каня

Другая бальшавіцкая папрабуе максымальнай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў. Павінна быць належна выкарыстана ўся наяўнасьць рабочай і цягавай сілы, увесь інвэнтар і с.-г. машыны.

Побач з трактарам, адным з асноўных сродкаў цягавай сілы ў нашым сацыялістычным сэктары выяўляецца конь. Вось чаму належная падрыхтоўка каня да палявых работ і наогул арганізацыя правільнага дагляду за ім выяўляецца вельмі важнай справай. У некаторых калгасах аддаецца мала ўвагі каню. Кулак і яго агенты распаўсюджваюць чуткі, што конь нібы не патрэбен. З гэтай шкоднай агітацыяй трэба весьці рашучую барацьбу.

Зараз, калі ўсе калгасы і саўгасы пераходзяць на зьдзельшчыну, калі конь прымацоўваецца да пэўнай асобы, вельмі лёгка арганізаваць належны дагляд за ім.

У гэтым артыкуле мы падаем, як уніхнуць захворваньня каня і як лячыць яго.

Па вэтстатыстыцы відаць, што коні больш за ўсё хварэюць вясной, у час пасеўнай работы; адна з хвароб—гэта колікі. Ад гэтай хваробы гіне 40—50 проц. коняй.

Колікі зьяўляюцца ў каня галоўным чынам ад няправільнага кармленьня і паеньня, а таксама пры кармленьні дрэнным кормам. Калі каню даць авёс зараз-жа пасьля работы, калі ён спацеўшы, дык адразу ў яго зьяўляюцца колікі—болі ў жываце. Калі каня перакармліць абсом і зараз-жа за прэгчы яго ў цяжкую работу, ці моцна яго пнаць,—ён таксама захварэе на колікі.

Колікі зьяўляюцца таксама, калі каня пасьвіць на вялікай расной траве. Галодны конь глытае корм, не пражоўваючы яго; корм разбухае і раздувае жывот, ад чаго бывае заварот кішок, зьяўляецца запор. Ад болі ў жываце конь пачынае лажыцца, качацца, то ўстане, то ляжа, глядзіць на бакі і калі сваячасова не аказаць вэт дапамогі, то конь можа праз некалькі гадзін здохнуць.

Каб уніхнуць колікаў у каня—ніколі ня трэба карміць яго перад работай, асабліва аўсом, ячменем, а таксама не паіць вельмі халоднай вадой.

Ніколі ня трэба карміць каня перад запражкай, а таксама зараз пасьля работы як зялёнай роснай канюшынай, так і збожжам.

Калі конь захварэе на колікі—ня трэба яго ганяць, як гэта часта робіцца. Гэта зусім не дапамагае каню, а толькі шкодзіць. Калі хворага на колікі каня пачнуць ганяць, ад гэтага можа здарыцца разрыў страўніка, або кішок, па-другое, ад моцнага руху яшчэ больш выдзяляюцца газы ад корму ў жываце, таму каню хвораму на колікі патрэбен поўны спакой. Каня трэба паставіць у хляве з мяккім подсьцілам. Хвораму каню трэба даць раствор крэаліны (1 сталовую лыжку крэаліны на ½ літра чыстай вады). Ня трэба расьціраць каню жывот палкай, як гэта робяць, асабліва асіна вай. Трэба расьціраць бакі саломеным вехцем са шпігінарам (дадаўшы ¼ вады) да таго часу, пакуль ня пойдзе пара з бакоў; 1-е кансэрвуе корм, не дае яму далей выдзяляць газы, а другое, дзейнічае на страўнік і дапамагае выхаду калу або газаў, чым і аблягчае боль у жываце каня. Лепш за ўсё паказаць хворага на колікі каня вэтэрынару.

Ніколі ня трэба адразу пераводзіць каня ад сухога корму (зімняга) на пашу, ад гэтага здараецца вялікая вольнасьць—гаспрыт, што робіць каня сла бым і непрацаздольным — ён ад гэтага худзее.

Другая перашкода, якая на колікі тыдню можа зрабіць каня непрацаздольным, гэта дрэнная вупраж. Ад цеснага хамута ў каня намулываюцца плечы і нават зьяўляюцца пухіры. Гэтыя пухіры або мулікі лопаюцца самі праз некалькі дзён ад ты дня, адкуль доўгі час цячэ гной. Каня запрагаць у гэты час нельга, бо інакш пухліна можа павялічыцца, ад якой конь можа загінуць. Каб уніхнуць гэтага трэба добра падбіраць хамут і сядзёлку для кожнага каня асобна, каб збруя добра была прыладжана да каня. Хамуціна і лямец павінны быць мяккімі і цэлымі. Калі ў каня на чынае мулінца карк ці плячо, дык трэба даць каню 1-2 дні адпачынку, узяць у вэтэрынара мазі і напіраць ёю пухліну і навокал яе скуру, прычым мазь трэба ўціраць проці поўсьці, а таксама прыкладаць гліну з воцатам, што таксама дапамагае зьмяншэньню пухліны.

Нашы калгаснікі і рабочыя саўгасаў павінны памятаць аб тым, што непраможнае выкананьне задач другой бальшавіцкай залежыць ад своячасовай і поўнай падрыхтаванасьці. Належная падрыхтаванасьць цягавай сілы—трактара, каня—будзе адыгрываць вялізарную ролю ў правядзеньні другой бальшавіцкай.

Вэтдоктар Грузакоў.

Выканаць пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб звароце мабілізаваных рабочых ад варштатаў

Пастанова

ЦКК НК РСІ БССР ад 12-га красавіка 1931 г.

аб ходзе выкананьня пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 25-III—31 г., аб «поўным спыненьні мабілізацыі рабочых ад варштату на патрэбы бягучых кампаній мясцовымі, партыйнымі

1. Канстатаваць, што матар'ялы, якія маюцца ў ЦКК НК РСІ сьведчаць аб тым, што вышэйпаказаная пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) асабліва ў частцы безадкладнага звароту на прадпрыемствы мабілізаваных ад 1-I—31 г. і вылучаных на савецкую работу пасьля пастановы ЦК УсеКП(б) ад 20-X—30 г. (п. п. 2 і 5 пастановы) ня поўнасьцю выканана.

2. Асабліва марудна праходзіць пера будова савецкіх, каапэрацыйных і іншых грамадзкіх арганізацый у сэнсе прыстасаваньня іх масавай работы да нерабочага часу.

3. Прапанаваць усім арганізацыям і ў першую чаргу дырэктарам прадпрыемстваў безагаворачна выканаць вышэйпаказаную пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) і аб усіх выпадках яе парушэньня паведамляць у адпаведныя органы КК РСІ, або непасрэдна ў ЦКК РСІ.

4. Даручыць Плянава-Кантрольнай Групе з удзелам мясцовых КК РСІ і прафсаюзаў у канцы красавіка месяца арганізаваць масавую праверку выкананьня гэтай пастановы.

Старшыня ЦКК КП(б)Б, Нарком РСІ БССР КАЛНІН.

Рабселькоры пішуць

У Абчугскім сельсавеце (Чарэйскі раён) культработа ў занядбадзе. Гучна гаварыцель у хаце-чытальні маўчыць, насьценгазэта не выдаецца. Мясцовая камсамольская яячэйка стаіць у баку ад культпрацы.

Зорка.

У м. Лёзна вельмі дрэнна абстаіць справа з пажарнай аховай. Пажарная дружына існуе толькі на паперы. Сходы ня склікаюцца. Машыны парасхіданы і ніхто ня ведае дзе яны знаходзяцца.

Сельсавет павінен прыняць усе захады каб у мястэчку Лёзна была заўсёды ратная наладжана пажарная ахова.

Капыраш.

Камсамольцы мястэчка **Стараселье (Копыскага раёну)** наладзілі суботнік па зборы ўтылю. Сабралі рознага жалеза, паперы, бутэляк і інш. утылю 15 цэнтнераў.

Калі яны зьвярнуліся да старшыні калгасу **«Барацьба» тав. Шаніцы М.,** каб апошні даў каня завесьці утыль у каапэрацыю дык ён адказаў:—**«Розным хамам каня ня дам».** і каня ня даў.

Асо.

НЕАСЬЦЯРОЖНАСЬЦЬ НА КАРЫСЬЦЬ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ. 29 сакавіка т.г. у саўгасе «Барэзіна» ад неасьцярожнасьці трактарыстаў загарэлася газа ў памяшканьні, дзе знаходзіўся трактар. Полымя ахапіла трактар і ён папсаваўся.

Ўнікатыя ў шадбайнасьці прыцягваюцца да адказнасьці.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Сёньня 14-IV г. г. а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні школы № 2 (Ленінская, 21) адбудзецца агульна-гарадзкая канфэрэнцыя Працасьветы.

Абвестка дню:

1. Чарговыя задачы прафработы ў адпаведнасьці з пастановамі V-га Пленуму УсеЦСПС.

2. Выбары дэлегатаў на міжсаюзную агульна-гарадзкую канфэрэнцыю.

Рэгістрацыя дэлегатаў з 6 з пал. гадз. увечары ў памяшк. 2-й школы.

14-га красавіка а 7 гадзіне ўвечары ў Камвузе (Унівэрсытэцкая, 27) адбудзецца нарада Т-ва гісторыкаў-марксыстаў разам з катэдрай па гісторыі народаў СССР і гісторыі партыі пры Камвузе па пытаньні: «Праграма ВУЗ'аў аб «Гісторыі Беларусі».

Запрашаюцца студэнцтва і настаўніцтва.

Уваход вольны.

Праўленьне.

Адказны рэдактар **П. ШАСТАКОЎ.**

ЗПАНЯДЗЕЛКА 13-гаКРАСАВІКА

Кіно-тэатр „Культура“	**Старац Васіль Гразноў** Хроніка № 13 Пач.: 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса—з 5 гадз.
„Чырвоная Зорка“	**ДЗЬВЕ СІЛЫ** Гукавы фільм ПОШТА Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	2-гі тыдзень 2-г тыдзень Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	2 фільма ў 1 сэанс. Пат і Паташон у лепшай к-мэдыі 1. Пачатак кар'еры у 7 частк. 2. Замежны паход у 2-х частк. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	Кіно-п еса у 6 частк. ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ Звыш праграмы хіно-хроніка № 16 Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

Да ведама кліентаў

УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКУ

І МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ.

I. Пачынаючы з 15 красавіка г. г. спыняецца прыём да аплаты рахункаў даручэньняў і чэкаў на сумы да 50 руб., прычым разрахункі на гэтыя сумы між аднагароднімі кліентамі ўтвараюцца наяўнымі.

Рахункі на інагароднюю кліентуру ў суме да 50 руб. могуць быць прыняты толькі да 28 красавіка, пасьля гэтага тэрміну парадкам, выкладзеным у інструкцыі па правядзеньні закона аб крэдытнай рэформе.

II. З таго-ж 15-га чысла спыняецца прыём рахункаў на аднагароднюю кліентуру на суму ніжэй 1000 руб. У гэтых выпадках разрахункі між кліентамі ўтвараюцца шляхам выдачы разьліковых (зваротных) чэкаў ці плацежных даручэньняў з паказаньнем у вымесьце аб тым, што гэткія выдадзены за тавар ці паслугі. Плацежныя даручэньні і чэкі прад'яўляюцца ў філіялах банку па месцы знаходжаньня кантакарэнтнага рахунку платніка і прымаюцца да выкананьня ў межах нескарыстанага крэдыту.

Усебеларуская кантора Дзяржбанку.
і Менскае гарадзкое аддзяленьне.

Даводзіцца да ведама ўсіх таварышоў,

якія залічаны на ПЭДФАК БДУ

ў веснавы набор

і не зьявіліся к 10-IV НА ЗАНЯТКІ, што ў выпадку іх няўкі да 20-IV-31 г., яны будуць ВЫКЛЮЧАНЫ з ліку студэнтаў і на іх месца будуць залічаны кандыдаты.

БЯЗ УМЕНЬНЯ КАРЫСТАЦЦА КНІГАЙ, НЕЛЬГА ПАБУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ. (ЛЕНІН)

БЕЛ ДЗЯРЖ ВЫДАВЕЦТВА

ВЫШАЙ ЗАРУКУ

ЗА САКАВІК МЕСЯЦ

СЭКТАР **КНІГА РАСПАДУ СЮДЖВАНЬНЯ**

Масава-палітычная літаратура

1. Ф. АНДЭРСОН. Партыя ў годы рэакцыі і ўзьніму. Цана 25 к., стар. 72, тыраж 3.000.
2. Я. БАЯРСКІ. XVI зьезд партыі аб рабоце прафсаюзаў. Цана 15 к., стар. 40, тыраж 5.000.
3. М. ГАЛАДЗЕД. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1931 г. Цана 20 к., стар. 72, тыраж 10.000
4. І. ГАЙДУЛЬ. XVI зьезд УсеКП(б) аб росьце партыі. Цана 10 к., стар. 46, тыраж 3.000.
5. Г. ГРЫСЭВІЧ. У барацьбе за трэці рашаючы. Цана 25 кап., стар. 56, тыраж 5.000.
6. Н. ЗАХАР. Рэвалюцыя 1848 г. у Нямеччыне. Цана 1 р. 12 к., стар. 186, тыраж 3.000.
7. А. ІВІН. За Савецкі Кітай. Цана 55 к., стар. 132, тыраж 4.000.
8. ІОЗЕФ. Клясы, партыі і саюзы моладзі Венгрыі. Цана 15 кап., стар. 68, тыраж 3.000.
9. КАГАНОВІЧ. Міжнароднае становішча і задачы комсамолу. Цана 10 к., стар. 40., тыраж 25.000.
10. М. КАКОРЫН. Вайсковая работа партыйнай яячэйкі. Цана 55 к., стар. 94 тыраж 3.000.
11. К. КАРНІЛАЎ. Самакрытыка і сэзоньнік-будаўнік Ц на 12 кап., стар. 54, тыраж 3.000.
12. З. КРАЙНЮК. XVI зьезд УсеКП(б) аб змаганьні з ракцыйным уплывам рэлігіі. Цана 10 кап., стар. 44, тыраж 5.000.
13. КАНЦЕЎ Вясковым камсамольцам аб XVI зьезьдзе. Цана 20 к., стар. 40, тыраж 3.000.
14. КУЗЬНЯЦОЎ. Прадукцыйнасьць працы. Цана 20 кап., стар. 50, тыраж 6.000
15. А. ЛЯСКОЎ. Буржуазія на фашысцкім шляху. Цана 12 кап., стар. 54, тыраж 3.000.
16. А. ЛЯСЬКОЎ. Марксысцкі зборнік. Цана 2 р. 50 к., стар. 280, тыраж 2.000.
17. В. МОЛАТАЎ. Народна-гаспадарчы плян на 1931 год. Цана 15 к., стар. 86, тыраж 25.000
18. Ф. НЮРЫНА. Работніца і сялянка кіруюць краінай. Цана 10 к., стар. 52, тыраж 5.000.
19. А. ПЛАТУН. За культурную рэвалюцыю. Цана 10 к., стар. 40, тыраж 10.000
20. Стэнаграфічная справаздача XIII зьезду КП(б)Б. Цана 4 р. 50 кап., стар. 830, тыраж 2 000.
21. Н. САВІЧАЎ. Як арганізаваць ударную брыгаду. Цана 5 кап., стар. 32, тыраж 5.000.
22. Н. СЕМАШКО. Партыя і быт. Цана 20 к., стар. 64, тыраж 5.000.
23. К. СОКАЛАЎ. „Левыя“ саюзьнікі правых апартуністаў у спажывецкай каапэрацыі. Цана 11 к., стар. 40, тыраж 7.000.
24. К. СОКАЛАЎ. Спажывецкая каапэрацыя адказвае за выкананьне пр мфінпляну. Цана 10 кап., стар. 48, тыраж 5.000.
25. Ф. СІХЛЯ. Румынія. Цана 22 к., стар. 62, тыраж 4.000.
26. СТАЛІН, МОЛАТАЎ і ОРДЖОНІКІДЗЕ. Задачы вялікіх работ. Цана 20 к., стар. 94, тыраж 35.000.
27. СТАЛІН, МОЛАТАЎ і ОРДЖОНІКІДЗЕ. Тварам да транспарту. Цана 10 к., стар. 52, тыраж 10.000
28. УГАРАЎ. Лесазагатоўкі і рабочая сіла Цана 12 кап., стар. 56, тыраж 7.000.
29. П. УСКАЎ. Хваробы капітальнага будаўніцтва. Цана 20 кап., стар. 62, тыраж 4.000.
30. А. ХАЦКЕВІЧ. Аб пераходзе ад акруговай сыстэмы кіраўніцтва на раённую. Цана 20 кап., стар. 84, тыраж 3.000.
31. ШАРАНГОВІЧ, МІЦЬКОЎ і КУРЦІК. Тэмпы рашаюць. Цана 45 к., стар. 132, тыраж 3.000
32. Е. ЯРАСЛАЎСКІ. Камуністы і рэлігія. Цана 45 кап., стар. 70, тыраж 5.000.

Літаратура па тэхніцы і палітэхнізацыі школы

1. АЛБЫЧАЎ. Вымерныя прылады. Цана 15 к., стар. 34, тыраж 5.000.
2. П. АЛБЫЧАЎ. Адбіваньні ліхтар. Цана 10 кап., стар. 20, тыр. 3.000.
3. Р. ГУРЖЫ. Сучасны стан і тэхніка выпрацоўкі натуральных фруктовых сокаў у Нямеччыне і Швайцарыі. Цана 95 к., стар. 92, тыраж 5.000.
4. Ф. КАРАЛЁЎ. Што такое політэхнізм. Цана 12 кап., стар. 56, тыраж 1.000.
5. Н. КРУПСКАЯ. Школа жыцьця (сэрыя „за політэхнізм“). Цана 7 к., стар. 30, тыраж 5.000.
6. Я. ШМУЙЛОВІЧ. Аўтамабіль. Цана 70 к., стар. 96, тыраж 10.000

Літаратура па пытаньнях працы, сан-асьветная і антырэлігійная

1. Разьмяшчэньне маладых спэцыялістаў на работу. Цана 20 к., стар. 62, тыраж 5.000.
2. А. ЛЯХ. Новыя правілы аб адпусках. Цана 25 к., стар. 78, тыраж. 5.000.
3. Ю. М. ІРГЕР. Першая дапамога ў нешчасных выпадках. Цана 15 к., стар. 62, тыраж 5.000.
4. З. МАГІЛЕЎЧЫК. Становішча і пэрспэктывы санітарнага аддаўленьня БССР. Цана 15 к., стар. 52, тыр. 5.000.
5. М. ФЛЕКЕЛЬ. Крыва ўка і як ад яе асьцерагчыся. Цана 25 к., стар. 60, тыраж 4.000.
6. І. А. АРШАНСКІ. Ці есьць душа ў целе чалавека і жывёлы. Цана 10 к., стар. 36, тыраж 5.000.
7. Г. КІСЯЛЁЎ. Ці могуць уваскрэсьці мёртвыя. Цана 40 к., стар. 98, тыраж 3.000.
8. Ем. ЯРАСЛАЎСКІ. Комуністы і рэлігія. Ц на 15 кап., стар. 72. тыр. 5.000.

Кнігі па калектывізацыі і сельскай гаспадарцы

1. Л. АПРЭСЯН. М. Т. С. і калгасы. Цана 10 кап., стар. 32, тыраж 30.000.
2. ВЯРЫГІН, ЗЬВЕЗДЫЧ, і МАРГУЛІС. Практыку заводаў у калгасы. Цана 15 кап., стар. 80, тыраж 4.000.
3. ГАРБУНОЎ і САЛДАЦЕНКА. Рапарт пе амог. Цана 20 кап., стар 62, тыраж 10.000.
4. ГАРБУНОЎ і САЛДАЦЕНКА. Колгасныя рулявыя, цана 10 кап., стар. 42. тыр. 7.000.
5. М. ІВАНОЎ. За зьдзельную працу у калгасах. Цана 5 кап., стар 16, тыраж. 40.000.
6. М. ІВАНОЎ. Контрактацыя яравых. Цана 20 кап. стар. 56, тыраж 10.000.
7. С. КУДЗІНАЎ. Што даў калгас аднаасобнікам. Цана 10 кап., стар. 24, тыраж 50 000.
8. С. КУДЗІНАЎ. Калгаснае будаўніцтва. Цана 63 кап., стар. 124, тыраж 3.000.
9. КУЗЬНЯЦОЎ. Масавая работа ў веснавую засеўную кампанію. Цана 17 к., стар. 52, тыраж 10 000
10. КРЫВАЛАПАЎ. Грамадзкае харчаваньне ў калгасах. Цана 15 к., стар. 64., тыраж 4 000.
11. ЛОДЫСЕЎ. Сельс веты і другая бяль авіцкая вясна. Цана 25 к., стар. 56, тыраж 25.000.
12. Прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі Цана 3 кап., стар. 14, тыраж 10.000.
13. ПЛАТОЎ. Камсамол і калгаснае будаўніцтва. Цана 15 к., стар. 80, тыраж 5.000.
14. ПЛАТОЎ. Рабочая праграма веснавых работ у калгасах. Цана 2 к., стар 10, тыраж. 15.000.
15. Ю. У. СТРЭЛЕ. Калгасы БССР да з'езду. Цана 20 к., стар. 72, тыраж 7.000.
16. К. ЯРАВЫ. Сёньнешні аднаасобнік—заўтрашні калгаснік. Цана 17 кап., стар 48, тыраж 7.000
17. В. А. АЛЕКСАНДРОЎ. Першая дапамога буйнай рагатай жывёле. Цана 12 кап., стар. 48, тыраж 18.000.
18. П. БАЛАШОЎ і Е. КАРПЕЕВА. Пасека ў колгасе і моладзь. Цана 20 к., стар. 52, тыраж 12.000.
19. А. С. БУТКЕВІЧ. Доглядпчоя у весну. Цана 40 кап., стар. 94, тыраж 12.000.
20. Я. ВАРКУНОЎ. Аб парадку сарміраваньня сіласаванага корму. Ц на 3 кап, стар. 10, тыраж 20.000.
21. Вядзеце вясной барацьбу са шкодні амі садоў. Цана ½ к., стар. 4, тыраж. 100.000.
22. К. ІВАНОЎ. Значэньне лесу, яго жыцьцё гадоўля, аднаўленьне. Цана 45 к., стар. 94, тыраж 5.000.
23. Ю. КРЭЙДЗІН. Стандартныя гатункі пладовых дрэў. Цана 45 к., стар 56, тыраж 3.000.
24. А. КОБАЗАЎ. Тарфяны подсьціл. Цана 75 кап., стар. 124, тыраж 7.000.
25. М. МАКСІМОВІЧ. Да веснавой сяўбы. Цана 3 кап., стар. 16, тыраж 50.000.
26. С. МАСКАЛЁЎ. Баражыце сельска-гаспадарчыя машыны. Цана 5 к., стар. 32, тыраж 25.000.
27. Павялічым ураджай гародніны, шляхам зьнішчэньня шкоднікаў. Цана ½ к., стар. 4, тыраж 100.000.
28. Пратручваньне насеньня—барацьба з сажаю, барацьба за высокі ўраджай. Цана 5 кап., лістоўка.
29. А. СКАМАРОХАЎ. Пільнуйце жывёлу ад заразы. Цана 4 к., стар 16, тыраж 25.000.
30. Д. СКІПА. Памятка лесазагатоўтоўшчыка. Цана 22 к., стар. 86, тыраж 7.000.
31. Г СТАДНІКАЎ. Хэмія торфу. Цана 1 руб., стар. 192, тыраж 5.000.
32. М. ХАЕЎ. Раньняе вырошчваньне гародніны і расады. Цана 22 кап., стар. 25, тыраж 5.000.
33. В. ЧЭМЕЛАЎ. Гадоўля цыбулі. Цана 15 кап., стар. 80, тыраж 6.000.
34. Як захоўваць насеньнікі капусты і каранылодаў. Цана 7 кап., стар. 30, тыраж 10.000.
35. Як арганізаваць працу і ільнаводчых калгасах.

Мастацкая літаратура

1. І. В. ДЗЬМІТРЫЕВА. Сенажаці. Цана 15 к п., стар. 72, тыраж 3.000.
2. ЗВОНАК. Загай (поэма). Цана 1 р., стар. 80, тыраж 2.000.
3. Н. ЛІПМАН. Далёка-ўсходняя. Цана 16 к., стар. 48, тыраж 5.000.
4. М. НІКАНОВІЧ. У паўстанцаў. Цана 30 к., стар. 62, тыраж 5.000.
5. Я. ПЯТРОЎСКІ. На фронце. (п'еса). Цана 40 кап., стар. 36, тыраж 2.000.
6. С. РАКІТА. Я агітую за пяцігодку. Цана 40 кап., стар. 64, тыраж 2.000.
7. М. РАВЕНСКІ. Прэлюдыя (ноты для фортэпіано). Цана 60 к., тыраж 500.
8. Л. СКРЫПНІК. Дом прымусовых работ. Цана 2 р. 25 коп., стар. 3 0. тыраж 3.000.
9. Ю. ТАЎБІН. Тры паэмы. Цана 40 к., стар. 30, тыраж 2000

Піянэрская дзіцячая літаратура

1. А. АЛЕЙНІКАЎ. Танкі і Санкі. Цана 10 к., стар. 20, тыраж 5.000.
2. А. АЛЕКСАНДРОВІЧ, КАЛЫХАНКА Хлопчык і певень (казкі). Цана 75 к., тыраж 5.000.
3. І. АЛЕКСАНДРОВІЧ. Акцябраты. Цана 65 кап., стар. 76, тыраж 3.000.
4. І. БОНЧ-БРУЕВІЧ. Замахона тав. Леніна. Цана 8 к., стар. 40, тыраж 7.000.
5. Г. ГРЫНЬБЕРГ. Цары і рэвалюцыя Цана 15 кап., стар. 30, тыраж 5.000.
6. А. ГУСЕЎ. Расьпём у баёх. Цана 23 к., стар. 66, тыраж 3.000.
7. Г. ДЗІТРЫХ. Казачата. Цана 60 к., стар 108, тыраж 5000.
8. ФЕЗІ-ЖЫЛІНСКАЯ. Бангешаў шлях. Цана 30 кап., стар. 72, тыраж 5.000.
9. Б. ІВАНТЭР.